гибели А. С. Пушкина, в ней было свое видение, свое понимание случившегося. Очень многим большим «дядям» и «тетям» — авторам великого множества статей о Пушкине и Мицкевиче — было полезно почитать работы детей, и поучиться у них мыслить самостоятельно, а не списывать друг у друга.

Учащиеся школ и гимназий издали свой поэтический сборник тиражом в 400 экземпляров с чудесным названием: «Про ночь, ветер, утро и горсточку снега…» В нем я нашел чудесные, искренне-поэтические строки.

Все, что было нами организовано в связи с 200-летием со дня рождения А. Пушкина (в том числе и А. Мицкевича), получило великую поддержку, помощь и понимание на нашей белорусской земле.

Мы открыли для себя и для всей России деревню Телуша, где покоится прах внучки А. С. Пушкина, Натальи Александровны Пушкиной (по мужу Воронцовой-Вельяминовой) — это один из корней генеалогического древа пушкинских потомков. Мы побывали там 15 мая 1999 года, возложили цветы на могилу внучки поэта, выступили с чудесным концертом в Телушской школе.

А после участия в Международном форуме «А. С. Пушкин и русская культура за рубежом», который состоялся в России, в Пушкиногорье, мы снова возвратились в деревню под Бобруйском, чтобы рассыпать землю, привезенную из Святогорского монастыря, где покоится прах А. С. Пушкина.

Невидимая духовная нить связала две точки, два духовных места на земле России и Беларуси, без которых нет «любви к родному пепелищу, любви к отеческим гробам».

Вместе со своим коллективом, Русским хором им. А. Никитиной мне пришлось объехать с концертами десятки сел, поселков, районных центров, областные города и глухие деревеньки Беларуси. У нас были встречи со студентами и школьниками, с учителями и сельскими жителями, с людьми военными и гражданскими, с дошкольниками и пенсионерами, со всеми слоями общества. И везде нас встречали тепло и искренне, слушая русские, белорусские и украинские песни. Везде нас старались угостить, напоить чаем, ответить чем-то добрым за ту духовную радость, которой мы делились с ними в своих песнях, чудесных наигрышах, хороводах, частушках, стихах.

Все это вместе взятое позволяет мне сказать следующее: к великому счастью, Беларусь является неким особенным островком духовности, которой сегодня не сыскать с огнем, островком доброты и нравственности.

Белорусский народ сохранил в себе многие прекрасные человеческие качества: он не подвержен экстремизму, «реформаторскому авантюризму». Он консервативен, как сама «земля-матушка»: одень ее в бетон, она взломает его, одень в асфальт, она пронижет его зеленой травой, а иначе бы земля погибла, и погибло бы все на ней…

Мой великий земляк, поэт Иван Бунин, побывав в Беларуси, сказал много справедливых и верных слов о белорусах. Он посетил Беларусь дважды: в 1888 году, когда ему было всего 18 лет, и в 1912 году, уже будучи известным писателем, академиком, автором великого произведения «Деревня». После он отмечал, что в белорусах воплотились лучшие черты славянства.

Иван Бунин жил в Беларуси полтора месяца и за это время, как великий художник, очень точно отметил главные характерные черты белорусов. Я живу в Беларуси уже 32 года, и могу только подтвердить то, о чем сказал мой земляк и мой любимый поэт Иван Бунин.

Возможность обретения своего национального суверенитета оказалась приобретением не только независимости, но и новых проблем, связанных с этим. Как показали дальнейшие события, все мы, находясь во времена СССР в определенных отношениях, психологически, нравственно и духовно оказались не готовыми к этому.

Вначале каждый стремился доказать, насколько это хорошо, что будучи независимыми, мы достигнем Бог знает каких результатов. Но эйфория свободы прошла, как некая болезнь, наступило «выздоровление», поскольку нужно было решать пришедшие со «свободой» проблемы.

Каждая нация, как правило, что-то приобрела, мы — русские — приобрели духовную опору более надежную, чем в России. Разве могли появиться десять лет назад национальные общественные объединения: корейцев, греков, немцев, цыган и т. д.? Или Республиканские фестивали национальных культур? Белорусы обрели государственность и в то же время стали «собирателями» наций вокруг себя. Это уже новое качество.

Обретя независимость и государственность, нужно определить свое местонахождение в мире, нужно найти свою составляющую в сообществе культур. Сегодня это беспокоит не только белорусов, но и нас, поскольку культура белорусская стала и нашей культурой, не только русских, но и всех наций, так как мы живем в едином государстве.

Это я понял, когда стал переводить Адама Мицкевича: мне стали близки и польская, и белорусская культуры. А недавно я закончил переводить его «Крымские сонеты», где есть такие слова:

Здесь грек талантлив и умен
Ваял классические формы,
Здесь для клинков пылали горны.

Звучал намаз, как дивный сон…
Сейчас — лишь ворона крыло;
Все, как от мора, умерло.

*(«Руины замка в Балаклаве»)*

После этого мне стали ближе греки и татары, и даже не те, что в сонете, а живые, с которыми мы вместе проводим фестивали национальных культур…

Я пришел к глубокому убеждению: нельзя добиться возрождения культуры и своего национального самосознания, живя в одном государстве изолированно, не заимствуя у народов близких по культуре или более отдаленных их черт и качеств, характеризующих их яркую и неповторимую самобытность.

Именно тогда все мы, такие разные по культуре, будем единой нацией Республики Беларусь.

Возрождение русского национального самосознания в русской национальной общности — задача необычайно сложная, требующая не только глубокого знания русской культуры, но и большого духовного трудолюбия, терпения и терпимости, целеустремленности и глубокой веры в это великое и благородное дело.

Но есть другие проблемы: каким образом все это доносить до русских людей, до своих соотечественников? Печатного органа нет и вряд ли предвидится в обозримом будущем. Самым массовым и доступным средством является радио.

К счастью, у нас сложились очень хорошие отношения с Белорусским радио. С помощью прекрасных радиожурналистов Лилии Коршун и Ивана Рыбицкого у нас за 6 лет вышло в эфир около 60 радиопередач. Это передачи о поэтах: Пушкине, Мицкевиче, Баратынском, Кольцове, Никитине, Бунине, Есенине, Рубцове, Прасолове, Жигулине, а также передачи: «Россия: прошлое, настоящее, будущее», «История русской поэзии», «Русская философская лирика. Истоки, преемственность», о встречах с писателями России, о поэтических литературных, музыкальных праздниках и фестивалях и т.д.

Иногда выходили целые циклы передач, например: о Пушкине — 15 передач, о Мицкевиче — 5 передач, о Рубцове — 5 передач, о Прасолове — 5. С помощью Белорусского радио нам удалось в 1999—2000 гг. выйти трижды в эфир «Радио России» через передачу «Две Руси». На нашу передачу о Пушкине на Белорусское радио пришло более 50 писем. Я назову географию этих писем: Архангельск и Архангельская область, Москва, Новокузнецк Кемеровской области, Ростов-на-Дону, и даже Южно-Курильск.

Приятно осознавать, что из Беларуси мы несем русского больше, чем его осталось в духовной памяти у самих русских в России.

Пред Родиной, как перед Богом,
Ты осени себя крестом.
Перед иконой в Храме строгом,
Перед былиной и кустом.

Пред тихой речкой за проселком,
Перед погостом за селом.
И пред жнивом, в детстве колком,
Что навсегда уже в былом.

Пред памятью и пред мечтою,
Пред всем хорошим, что ушло…
Пред рощей милой — за горою
И перед солнцем, что взошло!

**Алесь Смалянчук (Гродна, Беларусь)**

## ПАЛЯКІ МІНШЧЫНЫ І БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ (1916–1918 гг.)

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. польскі рух ва ўсходняй і цэнтральнай Беларусі актывізаваўся. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгралі палітычныя дзеячы Каралеўства Польскага, якія ў выніку нямецкага наступлення разам з тысячамі бежанцаў апынуліся ў Мінску. Адзін з іх, кіраўнік Мінскага аддзела Польскага таварыства дапамогі ахвярам вайны, сябра Партыі нацыянальных дэмакратаў [1], Уладыслаў Крыньскі ўзначаліў Часовы арганізацыйны камітэт па правядзенню з’езду палякаў Мінскай губерні.

21–23 мая 1917 г. у Мінску праходзілі пасяджэнні польскага з’езду. У яго працы ўдзельнічала 89 дэлегатаў. Падчас выбараў была відавочнай высокая ступень палітычнай актыўнасці сярэдніх слаёў польскай грамадскасці Міншчыны. Землеўласнікі сярод дэлегатаў з’езду складалі толькі каля 16% [2]. Аднак, як паказалі выбары кіраўніцтва, яны захавалі за сабой дамінуючую пазіцыю ў польскім руху.

Беларуская тэматыка даволі выразна была прадстаўлена на з’ездзе. Напрыклад, Эдмунд Івашкевіч заявіў пра салідарнасць палякаў з намаганнямі беларускага руху, пра гатоўнасць разам змагацца супраць тых, хто хоча знішчыць нацыянальна-гістарычныя асаблівасці краю. Вядомы мінскі адвакат казаў пра неабходнасць прызнання роўнасці ў правах за кожнай нацыянальнай супольнасцю пры ўмове, што яна будзе падпарадкоўваць свае

---

[1] Kieniewicz A. Nad Prypiecią, dawno temu... Wspomnienia zamierzchłej przeszłości. Wrocław, 1989. S. 446-447.

[2] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 1. S. 190.

вузканацыянальныя памкненні інтарэсам дабрабыту ўсёй Беларускай зямлі. Ён прапанаваў прыняць сістэму прапарцыянальнага прадстаўніцтва ўсіх нацый у органах самакіравання, у будучым аўтаномным сейме, у цэнтральных органах кіравання Расіі.

Галоўным вынікам працы стала стварэнне Польскай рады Мінскай зямлі (ПРМЗ). Асноўнай яе задачай абвяшчалася прадстаўніцтва і абарона інтарэсаў польскай грамадскасці Міншчыны. Для гэтага прадугледжвалася аб'яднанне ўсёй польскай грамадскасці і абуджэнне ў ёй пачуцця нацыянальнага адзінства шляхам актыўнай палітычнай, грамадскай, культурнай і гаспадарчай дзейнасці. Адзін з пунктаў выніковай пастановы адназначна сцвярджаў: кожны паляк, які жыве на Мінскай зямлі, павінен належаць да арганізацыі, што аб'ядноўвае ўсю польскую грамадскасць […] прызнаваць першынства гэтай арганізацыі і выконваць яе рашэнні» [3]. Рада складалася з дэлегатаў акругаў або паветаў, выбраных на падставе ўсеагульнага галасавання. Пастаянным рабочым органам Рады з'яўляўся Выканаўчы камітэт, які выбіраўся з ліку яе сяброў. Было заяўлена пра неабходнасць стварэння аналагічнай Рады для ўсёй Беларусі, а пазней і для ўсіх т. зв. «крэсаў». Створаная арганізацыя адыграла даволі значную ролю ў польскім руху. У польскай гістарыяграфіі Рада Мінскай зямлі характарызуецца як «неафіцыйны польскі парламент» [4].

Дэлегаты з'езду абралі Раду і Выканаўчы камітэт. Старшынёй гэтых двух органаў стаў Еранім Кяневіч, землеўласнік з Мазырскага пав. У склад Камітэта таксама ўвайшлі Эдмунд Івашкевіч, Вітольд Ванькові́ч, Канстанцін Дэмідэцкі-Дэмідовіч, ксёндз Міхал Маеўскі, Уладыслаў Крыньскі і інш. У складзе Рады і Камітэта пераважалі прадстаўнікі «беларускіх палякаў» [*]. Хаця многія вядомыя дзеячы, як, напрыклад, старшыня Мінскага сельскагаспадарчага таварыства Эдвард Вайніловіч, аказаліся па-за межамі арганізацыі.

---

[3] Nowy Kurier Litewski. 1917. Nr. 126.

[4] Zienkiewicz T. Polskie życie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX w. (do roku 1921). Olsztyn, 1997. S. 111; Chwalba A. Historia Polski.1795–1918. Kraków, 2000. S. 584.

[*] Выкарыстанне гэтага паняцця патрабуе тлумачэння. Пры характарыстыцы этнакультурнага феномену палякаў Беларусі і Літвы даследчыкі (Ю. Бардах, Р. Мікніс і інш.) ужо адзначалі, што ў свядомасці гэтых палякаў іх прыналежнасць да польскай культуры спалучалася з выразным успрыняццем Беларуска-літоўскага краю як сваёй Радзімы. Некаторыя прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты мясцовых палякаў, як, напрыклад, Міхал Ромэр, называлі сябе «літоўскімі палякамі». Вось як характарызаваў гэты феномен у 1915 г. карэспандэнт газеты «Myśl Polska»: «Польскасць у Літве (маецца на ўвазе «гістарычная Літва». — *А. С.*) абсалютна незалежная ад лозунгаў, што ідуць з Варшавы. Гэта асобная, лакальная польскасць. Толькі ад мясцовых фактараў залежыць, ці поўніцца справамі яе жыццё, ці яна гіне ў бяздзейнасці. Пра «вяртанне» літоўскіх палякаў у этнаграфічную Польшчу не можа быць і размовы, бо яны і не прыходзілі ў Літву з Польшчы. Літва – гэта адзіны край, з якім яны этнаграфічна звязаныя». Літоўскі даследчык Рымантас Мікніс, які прывёў гэтую цытату ў адным з артыкулаў (Miknys R. Problem kształtowania się nowoczesnego narodu >

Ежы Асмалоўскі сцвярджаў, што Рада і Камітэт знаходзіліся ў цэнтры польскага руху паміж нацыянальнымі дэмакратамі і Мінскім сельскагаспадарчым таварыствам. Першыя («эндэкі») не бачылі адметнасці ні Беларусі, ні беларускіх палякаў і выступалі за пабудову польскай нацыянальнай дзяржавы, у тым ліку і на беларускіх землях. Другія (сябры Таварыства) прыхільна ставіліся да краёвай ідэалогіі і не прымалі польскага нацыяналізму. ПРМЗ падтрымлівала права самавызначэння народаў, выступала за паразуменне з беларусамі дзеля дасягнення калі не суверэннасці, то хаця б аўтаноміі Беларусі. Яна адвяргала канцэпцыю інкарпарацыі беларускіх зямель у склад Польшчы [5].

Аднак непасрэдных кантактаў паміж ПРМЗ і БНК не было. Паводле ацэнкі Е. Асмалоўскага, Рада дэманстравала «платанічную прыхільнасць» да беларускай арганізацыі, што ў рэальнай палітыцы абарочвалася ігнараваннем БНК. Са свайго боку Беларускі камітэт таксама не прапаноўваў Радзе супрацоўніцтва, аддаючы перавагу кантактам з асобнымі польскімі арганізацыямі дзеля вырашэння канкрэтных праблемаў [6]. Відавочна, што кіраўніку БНК Раману Скірмунту значна бліжэй была пазіцыя Эдварда Вайніловіча і той краёвай групоўкі, цэнтрам якой з'яўлялася Сельскагаспадарчае таварыства ў Мінску.

З 1 ліпеня 1917 г. ПРМЗ пачала выдаваць «Дзеннік Міньскі». Ягонымі першымі рэдактарамі сталі сябры Рады Фелікс Хільхэн і Мар'ян Масоніус. «Новы Кур'ер Літэвскі», польская газета, якая выдавалася ў Менску са жніўня 1915 г., спыніў свае існаванне. Некаторыя даследчыкі з упадкам газеты звязваюць крызіс «эндэцыі» ў Беларусі ў гэты перыяд [7]. «Новы

---

> Polaków litewskich w pierwszej połowie XX w. // Biuletyn Historii Pogranicza. Nr.1. Białystok, 2000. S. 23), лічыць, што ў пачатку XX ст. існавалі пэўныя ўмовы фарміравання нацыі літоўскіх палякаў (Тамсама, с. 27–28). Яе асноўную масу маглі скласці носьбіты т. зв. «тутэйшасці». Узнікненне польскай і літоўскай нацыянальных дзяржаў перашкодзіла гэтаму працэсу.

Развіццё літоўскага нацыянальнага руху выклікала пэўную трансфармацыю паняцця «літоўскія палякі». Нацыянальныя памкненні літоўскага этнасу спрыялі таму, што частка эліты «літоўскіх палякаў» пачала актыўна звяртацца да элементаў этнічнай літоўскай культуры. Слова «літоўскія» ў словазлучэнні «літоўскія палякі» звязвалася ўжо не толькі з «гістарычнай», але і з «этнаграфічнай» Літвой. У той жа час па меры развіцця беларускага руху «літоўскія палякі», якія жылі на этнічных беларускіх землях, падпадалі пад пэўныя ўплывы беларускасці. Можна назваць імёны Эдварда Вайніловіча, Аляксандра Ельскага, Марыі Магдалены Радзівіл і Рамана Скірмунта. Аўтарытэт, якім карысталіся названыя прадстаўнікі эліты «беларускіх палякаў» (за выключэннем М.-М. Радзівіл), сведчыць пра тое, што беларускасць у той ці іншай форме прысутнічала ў свядомасці значнай часткі польскай грамадскасці на этнічных беларускіх землях.

Усё гэта дае падставы для ўжывання паняцця «беларускія палякі».

[5] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 1. S. 197.

[6] Тамсама. S. 221.

[7] Zienkiewicz T. Polskie życie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX w. (do roku 1921). Olsztyn, 1997. S. 47–48.

Кур'ер» і сапраўды вельмі прыхільна ставіўся да ідэалогіі Партыі нацыянальных дэмакратаў, што, дарэчы, знаходзіла пэўнае адлюстраванне ў падыходах да беларускага пытання. Для публікацый газеты таксама было характэрна традыцыйна варожае для эндэцыі стаўленне да той часткі польскай грамадскасці, якая на самым пачатку стагоддзя спрычынілася да фарміравання краёвай плыні ў грамадска-палітычным жыцці Беларуска-літоўскага краю. Аўтар артыкула «Пра польскасць на крэсах», адзначыўшы мімаходзь, што беларускі рух быў створаны чыноўнікамі канцылярыі Віленскага генерал-губернатара і польскімі сацыялістамі, заявіў пра традыцыйны польскі абавязак падтрымкі імкнення да свабоды і культурнага развіцця ўсіх народаў. Пры гэтым аўтар катэгарычна заявіў, што «мы, палякі, павінны заставацца палякамі. Як толькі мы пачнем апранацца ў маскі, выдаваць сябе за беларусаў польскай культуры, мы страцім давер сярод сваіх і не знойдзем яго ў беларусаў». Падвоенасць свядомасці, характэрную для многіх беларускіх палякаў, ён лічыў або двудушнасцю або адхіленнем ад нормы, якое моцна шкодзіць польскай справе [8]. Галоўным аб'ектам крытыкі была беларуская дзейнасць Рамана Скірмунта, з якім польская эндэцыя мела даўнія рахункі. Імя Скірмунта не называлася, але ягоная постаць лёгка адгадвалася.

У пачатку 1917 г. Р. Скірмунт з'яўляўся адным з кіраўнікоў беларускага нацыянальнага руху. У сакавіку 1917 г. ён узначаліў Беларускі нацыянальны камітэт. А ў наступным месяцы на чале дэлегацыі БНК спрабаваў весці перамовы з прадстаўнікамі Часовага ўрада пра аўтаномію Беларусі. Адначасова ён заставаўся віцэ-старшынёю Мінскага сельскагаспадарчага таварыства і падтрымліваў сувязі з дзеячамі польскага руху на Міншчыне. Казімір Акуліч акрэсліў дзейнасць Р. Скірмунта як «апошні акт польска-беларускага сімбіёзу» [9]. З гэтай ацэнкай у пэўным сэнсе можна пагадзіцца. Р. Скірмунт сваёй дзейнасцю, быццам, працягваў традыцыі як польска-беларускіх літаратараў XIX ст. (Ян Чачот, Людвік Кандратовіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і інш.), у творчасці якіх у пэўным сэнсе спалучаліся польскасць і беларускасць, так і тых палітыкаў-змагароў, якія ў часы антырасійскіх паўстанняў спрабавалі абаперціся на карэннае насельніцтва беларускіх і літоўскіх зямель (Кастусь Каліноўскі). У гэты перыяд Раман Скірмунт быў постаццю польска-беларускага дыялогу, амаль што ідэальнай асобай для кантактаў двух нацыянальных рухаў. Ён адыграў не апошнюю ролю ў тым, што на працягу амаль усяго паслялютаўскага 1917 г. адносіны польскай грамадскасці да беларускага руху заставаліся даволі прыязнымі.

«Дзеннік Міньскі» выразна адмежаваўся ад ідэалогіі эндэцыі. У рэдакцыйным артыкуле № 1 «Дзенніка» адзначалася: «Мы прызнаем права

---

[8] Nowy Kurier Litewski. 1917. Nr 104.

[9] Okulicz K. Podział ziem W. Księstwa Litewskiego 1915–1923–1940 // Alma Mater Vilnensis + Prace Społeczności Akademickiej USB na obczyźnie. Londyn, 1953. S. 122.

кожнага народа на развіццё і будзем імкнуцца да добрасуседскіх адносінаў з тымі, хто лічаць сябе грамадзянамі краю і жадаюць працаваць дзеля яго росквіту. У адносінах з беларусамі, адвечнымі жыхарамі і гаспадарамі краю, з якімі нас яднаюць не толькі стагоддзі сумеснай гісторыі, але і агульнасць крыві, мы будзем імкнуцца […] спрыяць іх дабрабыту і развіццю культуры, будзем разам змагацца за шырокую аўтаномію Белай Русі». Як відаць, дэкларaваныя мэты палітычнай дзейнасці польскай грамадскасці Міншчыны не разыходзіліся з мэтамі беларускага нацыянальнага руху.

На працягу лета 1917 г. працягвалася стварэнне польскіх арганізацый, якія аб'ядноўвалі бежанцаў з Каралеўства Польскага і беларускіх палякаў. У ліпені 1917 г. у Магілёве была створана Польская рада Магілёўскай зямлі. На арганізацыйным з'ездзе прысутнічаў прадстаўнік ужо створанай Віцебскай рады [10]. У прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі з'езда выказалі намер дамагацца аўтаноміі Беларусі з прызнаннем правоў нацыянальных меншасцяў [11]. Пасля гэтага Мінская, Магілёўская і Віцебская рады аб'ядналіся ў Польскую раду Беларускай зямлі, прадстаўнікі якой прынялі ўдзел у працы маскоўскай Дзяржаўнай нарады ў жніўні 1917 г.

У канцы гэтага месяца кіраўнікі ПРМЗ удзельнічалі ў сходзе Крэсовай Польскай рады ў Кіеве. Было вырашана распрацаваць «Статут польскага насельніцтва на Русі» як падставу сістэмы польскага самакіравання на тэрыторыях Беларусі, Літвы і Украіны [12]. Відавочна, што яшчэ летам 1917 г. польская грамадскасць Беларусі не звязвала свой лёс з польскай дзяржавай, якая існавала пры падтрымцы Германіі і Аўстра-Венгрыі.

Аднак паступова настроі польскай грамадскасці змяняліся. Польскі даследчык Т. Зянкевіч лічыць, што беларускія сімпатыі зніклі ўвосень 1917 г. Ён звярнуў увагу на артыкул «Палітыка крэсаў», які быў надрукаваны 9 кастрычніка 1917 г. на старонках «Дзенніка Міньскего». У публікацыі падкрэслівалася, што «польскія інтарэсы патрабуюць, каб мы (палякі. — *А. С.*) былі перш за ўсё польскімі грамадзянамі ў Беларусі». (Варта нагадаць, што раней звычайна гаворка ішла пра грамадзянаў краю.) Упершыню ў польскім мінскім друку як мяжа польскага рассялення згадвалася мяжа 1772 г. [13] Артыкул «Важны момант», надрукаваны ў канцы кастрычніка 1917 г. за подпісам «Т. Я.» (магчыма, гэта Тадэвуш Яворскі, палітычны дзеяч з КП, які ў лютым 1918 г. зойме пасаду рэдактара «Дзенніка Міньскего»), заканчваўся лозунгам: «Нашая Айчына — гэта Польшча!» Галоўнай ідэяй публікацыі быў заклік да сумеснай працы ўсіх палякаў дзеля Польшчы [14]. Магчыма, што ўвосень 1917 г. «групоўка бежанцаў» пачала адыгрываць больш

---

[10] Dziennik Miński. 1917. Nr 4.

[11] Тамсама. Nr 5.

[12] Тамсама. Nr 52.

[13] Zienkiewicz T. Polskie życie.… S. 49.

[14] Dziennik Miński. 1917. Nr 99.

прыкметную ролю ў польскім руху. Чакаць ад іх прыхільнасці да краёвай ідэалогіі не прыходзілася, тым больш, што ў Варшаве ўмацоўваліся пазіцыі Рэгенцыйнай Рады. Зрэшты, у гэты час і адносіны мясцовай польскай грамадскасці да беларускага руху не маглі не змяніцца.

Летам 1917 г. стала відавочным дамінаванне ў беларускім руху Беларускай Сацыялістычнай Грамады (БСГ) з яе досыць радыкальнымі падыходамі да вырашэння аграрнай праблемы ў Беларусі. Спроба Рамана Скірмунта стварыць, па словах Вінцэнта Гадлеўскага, «беларускую абшарніцкую партыю» [15] была няўдалай. Нічога не дала таксама яго прапанова пра кааптацыю ў склад БНК прадстаўнікоў патомнай шляхты і арыстакратыі Беларусі [16]. У ліпені 1917 г. БНК фактычна быў зліквідаваны, і Раман Скірмунт сышоў з першых пазіцый у беларускім руху.

На польска-беларускія адносіны не магло не паўплываць абвастрэнне сацыяльных адносінаў у вёсцы. Хуткая радыкалізацыя настрояў сацыяльных нізоў, асабліва прыкметная пасля захопу ўлады бальшавікамі, рэзка актуалізавала аграрную праблему. Позняй восенню 1917 г., зімой 1917–18 гг. па Беларусі пракацілася хваля нападаў на памешчыцкія маёнткі. Іх завадатарамі часта былі салдаты-дэзерціры. Але і мясцовае насельніцтва, якое раней звычайна знаходзілася ў даволі прыязных адносінах з мясцовымі землеўласнікамі [*], цяпер прыняло актыўны ўдзел у рабаваннях і забойствах. Так, у лістападзе 1917 г. быў разгромлены маёнтак Дзерашэвічы (Мазырскі пав.) старшыні ПРМЗ Е. Кяневіча, у лютым 1918 г. быў знішчаны маёнтак Савічы (Слуцкі пав.) старшыні Мінскага сельскагаспадарчага таварыства Э. Вайніловіча, які адрозніваўся патрыярхальна-патэрналісцкімі адносінамі да сялянства [17]. Такі самы лёс спасціг і шмат іншых памешчыцкіх сядзібаў. «Дзеннік Міньскі» быў перапоўнены паведамленнямі пра напады і падрабязнымі апісаннямі таго дзікунства, якое дэманстраваў натоўп дэзерціраў і сялянаў.

Тым не менш сцвярджэнне Т. Зянкевіча падаецца занадта катэгарычным. Магчыма, польская грамадскасць стала больш крытычна ацэньваць намаганні беларускага руху, але, як здаецца, яна па-ранейшаму бачыла ў ім свайго верагоднага саюзніка. Так, «Дзеннік Міньскі», як і наогул польская грамадскасць Міншчыны, прывітаў Усебеларускі з’езд. Пры гэтым была выказана надзея, што карэнныя жыхары краю пры акрэсленні месца палякаў будуць кіравацца прынцыпамі права, справядлівасці і самавызначэння народаў [18].

---

[15] Гадлеўскі В. З беларускага палітычнага жыцця ў Менску ў 1917–18 гг. // Спадчына. 1997. № 5. С. 23.

[16] Тамсама. С. 22–23.

[*] Э. Вайніловіч у сваіх успамінах характарызаваў беларусаў як «спакойны, здаровы ў сваіх паняццях народ» (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 1135, воп. 20, адз. зах. 752, арк. 161).

[17] Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 1135, воп. 20, адз. зах. 752, арк. 79.

[18] Dziennik Miński. 1917. Nr 135.

Аднак у канцы 1917 г. адносіны паміж ПРМЗ і беларускімі арганізацыямі пагоршыліся. Напрыклад, Рада Усебеларускага з'езда не мела непасрэдных кантактаў з Польскай радай. Затое, як сцвярджаў Е. Асмалоўскі, добрыя адносіны склаліся з «Беларускім камітэтам» [19] . (Хутчэй за ўсё «Беларускім камітэтам» ён называў тую арганізацыю, якая пазней ператварылася ў Мінскае Беларускае прадстаўніцтва.). Аўтар успамінаў адзначыў, што прадстаўнік гэтай беларускай агранізацыі Аляксандр Прыстар пастаянна прысутнічаў на пасяджэннях Выканкама Рады, а ў працы «Камітэта» ўдзельнічаў Чэслаў Крупскі.

Істотным фактарам польска-беларускіх адносінаў было стварэнне і дзейнасць у Беларусі Польскага корпуса генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага. Праўда, відавочным гэта стала не адразу. Трэба прызнаць, што пытанню ўтварэння польскіх узброеных сілаў ПРМЗ шмат увагі пачала надаваць пасля бальшавіцкага перавароту. Міхал Касакоўскі ў сваім дзённіку апісаў польскую нараду ў Мінску 13 лістапада 1917 г., на якой між іншым абмяркоўвалася «вайсковае пытанне». Як сенсацыю, ён ахарактарызаваў выступленне Р. Скірмунта, які ўпершыню выказаў сімпатыі да Польшчы. (Раней М. Касакоўскі адзначаў ягонае дэманстратыўнае адмежаванне ад інтарэсаў Польшчы). Паводле запісаў у дзённіку, Р. Скірмунт заклікаў ствараць у Беларусі польскае войска з мэтаю «выканання вялікага запавету Рэчы Паспалітай» [20].

Той жа дзённік паведамляе пра сакрэтную нараду на кватэры князя Святаполк-Мірскага 15 лістапада 1917 г., на якой прысутнічалі Е. Кяневіч, Р. Скірмунт, Ч. Крупскі, Э. Івашкевіч і аўтар успамінаў. Было прынята рашэнне аб падтрымцы дзейнасці Вярхоўнага польскага вайсковага камітэта (Начполя). На падставе паведамлення М. Касакоўскага можна сцвярджаць, што Р. Скірмунта і элітную групоўку беларускіх палякаў аб'ядноўвала жаданне як мага хутчэй стварыць свайго роду «абарончы мур», які б аддзяліў Беларусь ад бальшавіцкай Расіі. На гэтым жа сходзе Р. Скірмунт пратэставаў супраць ужывання тэрміну «крэсы» ў дачыненні да Беларусі і настойваў на паняцці «край». У выніку нарады яе ўдзельнікі ўтварылі тайную пазапартыйную групу, адзінай мэтай якой абвяшчалася падтрымка стварэння польскага войска ў Беларусі [21] . Апроч удзельнікаў нарады ў групу ўвайшоў Ігнацы Віткевіч.

Гісторыя І Польскага корпуса пачалася на з'ездзе вайскоўцаў, які адбыўся ў Петраградзе ў чэрвені 1917 г. Ініцыятарамі з'езда былі Саюзы палякаў-вайскоўцаў, якія пасля звяржэння царызму ўзніклі амаль на ўсіх франтах. З'езд прыняў рашэнне пра аб'яднанне ўсіх ваеннаслужачых палякаў

---

[19] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 1. S. 214.

[20] Archiwum PAN. T. 4. Diariusz M. Kossakowskiego. S. 396.

[21] Тамсама. С. 402.

у адным падраздзяленні пад камандай польскіх афіцэраў. Дэлегаты абралі Галоўны Польскі вайсковы камітэт («Начполь») на чале з харунжым Уладзіславам Рачкевічам. Начполь здолеў дабіцца згоды Вярхоўнага Галоўнакамандуючага на фармаванне трох польскіх корпусаў. І ПК фармаваўся на Заходнім фронце пад камандай генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага ў складзе трох пяхотных дывізій, двух артылерыйскіх брыгадаў і батарэі цяжкай артылерыі. Штаб корпуса знаходзіўся ў Мінску.

Начполь, які ажыццяўляў палітычнае кіраўніцтва І ПК, разгарнуў актыўную дзейнасць па яго фармаванню, заклікі і звароты да запісу ці пераводу ў польскі корпус друкаваліся ў «Дзенніку Міньскім» і на старонках ўласнай газеты Начполя «Жолнеж Польскі». Было створана Таварыства сяброў польскага салдата, на чале якога стаў Міхал Касакоўскі [22]. Увосень у корпусе налічвалася ўжо каля 25 тыс. чал., з якіх каля 3 тыс. былі афіцэрамі. Апошняя лічба звяртае на сябе ўвагу. Шмат хто з афіцэраў шукаў у польскім корпусе паратунку ад бальшавізацыі войска. І сапраўды, у корпусе адсутнічалі салдацкія камітэты, замененыя камісарамі Начполя. Магчыма, менавіта гэта спрычынілася да абвінавачванняў камандавання ў рэакцыйнасці. Што датычыць Начполя, то ён пастаянна падкрэсліваў палітычны нейтралітэт і беспартыйнасць польскага корпуса.

Упершыню корпус паказаў сябе падчас святкавання 100-годдзя смерці Тадэвуша Касцюшкі 5 лістапада 1917 г. Кульмінацыяй свята стаў ваенны парад на Кафедральнай плошчы Мінска, які сярод прысутнай польскай грамадскасці выклікаў велізарны патрыятычны ўздым.

Часткі корпуса былі раскіданыя на тэрыторыі Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. Толькі пасля падзення Часовага Урада Галоўнае камандаванне згадзілася на канцэнтрацыю падраздзяленняў корпуса ў раёне Бабруйск-Слуцк. Бальшавікі, а менавіта Галаўкам М. Крыленка, паспрабавалі не дапусціць гэтай канцэнтрацыі. Аднак камандаванне корпуса працягвала сцягваць войскі ў Бабруйск. Пунктам сутыкнення стала таксама адмова выканаць загад пра стварэнне салдацкіх камітэтаў.

Бальшавіцкія спробы раззбраення польскіх частак прывялі да ўзброеных сутыкненняў. 19 студзеня 1918 г. Крыленка загадаў распусціць Польскі корпус. У адказ генерал Ю. Доўбар-Мусніцкі заняў Бабруйск. Фактычна, паміж бальшавіцкай расійскай арміяй і ПК пачаліся ваенныя дзеянні. Увесну 1918 г. «Дзеннік Міньскі» надрукаваў імёны загінуўшых польскіх салдатаў і афіцэраў. Нават у няпоўных спісах значылася больш 250 чал.

У беларускай гістарыяграфіі адносна дзеянняў І Польскага корпуса маюцца ацэнкі савецкіх гісторыкаў. У прыватнасці, сцвярджаецца, што выступленне Ю. Доўбар-Мусніцкага прадугледжвала «далучэнне Беларусі да Польшчы» [23]. Аднак аналіз успамінаў Е. Асмалоўскага і М. Касакоўскага,

---

[22] Dziennik Miński. 1917. Nr 37.

[23] Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 частках. Пад рэд. М. Касцюка і інш. Мн., 1995. Ч. 2. С. 37.

публікацый «Дзенніка Міньскего» сведчыць, што галоўнай мэтай т. зв. «мяцежа» польскага корпуса было імкненне пазбегнуць бальшавізацыі, адстаяць яго самастойнасць і баяздольнасць дзеля змагання за незалежную Польшчу. Ідэя далучэння часткі Беларусі, якую кантраляваў корпус, да Польшчы з'явілася пазней, увесну 1918 г. [24]

Менавіта ў час гэтай першай польска-бальшавіцкай вайны мясцовыя ўлады (напрыклад, камісар Ігуменскага пав.) пачалі абвінавачваць Польскі корпус у гвалтах і насіллі над беларускім насельніцтвам [25]. Такія выпадкі разыходзіліся з палітычнай пазіцыяй практычна ўсіх польскіх арганізацый Міншчыны, у т. л. і Начполя, якія падтрымлівалі імкненне беларускіх палітыкаў да аўтаноміі і згаджаліся, што палітычныя межы Беларусі будуць вызначацца этнаграфічнымі межамі рассялення беларускай нацыі. Вельмі адмоўна рэагавала на паводзіны польскіх вайскоўцаў і частка эліты беларускіх палякаў (гл. Дадатак).

У канцы студзеня польскі корпус аказаўся ў вельмі цяжкай сітуацыі. 2 лютага 1918 г. на пасяджэнні ПРМЗ абмяркоўвалася становішча корпуса. Удзельнікі абмеркавання, сярод якіх быў і Раман Скірмунт як прадстаўнік «Беларускага камітэта» (верагодна, Е. Асмалоўскі, які паведаміў пра гэтае пасяджэнне, пад «Беларускім камітэтам» разумеў Мінскае беларускае прадстаўніцтва. — *А. С.*) прыйшлі да высновы, што выратаваць корпус ад разгрома можа толькі ўмяшальніцтва Германіі. Было прынята рашэнне звярнуцца да германскага ваеннага камандавання з просьбай прапусціць корпус на тэрыторыю Польшчы. Наступным крокам супрацоўніцтва павінна была стаць сумесная (нямецка-польская) акупацыя Беларусі з мэтай адарвання яе ад Расіі, што ў далейшым павінна было прывесці да выпрацоўкі пэўнай формы самастойнага існавання Беларусі. Гэтая пазіцыя знайшла падтрымку на сумеснай нарадзе з прадстаўнікамі Начполя [26]. Дарэчы, пры вызначэнні персанальнага складу дэлегацыі ўдзельнікі нарады, і асабіста Еранім Кяневіч, настойвалі на кандыдатуры Рамана Скірмунта. Аднак апошні знайшоў прэтэкст, каб адмовіцца ад гэтай прапановы [27].

Рашэнне пра пасылку дэлегацыі супярэчыла ранейшай антантафільскай пазіцыі Начполя. Гэтая пераарыентацыя адбылася ў той момант, калі старшыня Начполя знаходзіўся ў Кіеве, дзе вёў перамовы з Польскай Радай міжпартыйнага аб'яднання пра дапамогу польскаму корпусу. Перамовы ў Кіеве закончыліся паспяхова. Пасля гэтага У. Рачкевіч распусціў Начполь і ўтварыў Вярхоўную вайсковую Раду. Генерал Ю. Доўбар-Мусніцкі атрымаў магчымасць самастойных палітычных дзеянняў. Першым ягоным крокам стала

---

[24] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 2. S. 329.

[25] Тамсама. С. 207.

[26] Тамсама. С. 227–228.

[27] Тамсама. С. 229.

тэлеграма да генерала Хофмана, прадстаўніка германскага камандавання ў Брэсце, у якой ён прасіў прыняць дэлегацыю корпуса. Усё гэта адбылося амаль адначасова з рашэннем, якое было прынята на згаданай нарадзе ў Мінску. Няўзгодненасць у дзеяннях у далейшым прывяла да непаразумення паміж камандаваннем корпуса, з аднаго боку, Начполем і Радай, з другога.

Перамовы пачаліся ў Брэсце 12 лютага 1918 г. і праходзілі для польскай дэлегацыі досыць цяжка. Дзеянні польскага корпуса немцы трактавалі як спробу польскай акупацыі Беларусі, што Берлін лічыў недапушчальным. Толькі пасля ўмяшальніцтва прадстаўніка Рэгенцыйнай Рады, якая падтрымала пазіцыю дэлегацыі і пераканала немцаў, што Польшча не мае анексійных намераў адносна Беларусі, сітуацыя змянілася.

Аднак у ход перамоваў умяшаліся ваенныя падзеі. 18 лютага 1918 г. пасля адмовы Льва Троцкага прыняць германскія ўмовы міру, пачалося наступленне нямецкіх войскаў. Вечарам 19 лютага бальшавікі пакінулі Мінск. У ноч з 19 на 20 лютага 1918 г. сітуацыю ў горадзе кантралявалі ўжо польскія і беларускія арганізацыі. Была створана Польска-беларуская камендатура, якая ўзяла на сябе абарону жыцця і маёмасці жыхароў горада, а таксама падтрыманне ў ім парадку [28].

З аналагічнай заявай ад імя Польскай грамадзянскай аховы выступіў у гарадской Думе былы гарадскі галава Станіслаў Хшанстоўскі. На гэтым самым пасяджэнні таксама выступілі прадстаўнікі беларускай і польскай вайсковых арганізацый (ад беларусаў Язэп Варонка), якія заявілі, што вайсковая ўлада ў горадзе знаходзіцца ў руках Польска-беларускай камендатуры. Цывільная ўлада засталася ў Думы. Павел Аляксюк патрабаваў, каб у гарадской Думе прадстаўніцтва беларусаў было павялічана з двух да шасці чалавек. Патрабаванне не прынялі, але ўвялі беларуса (А. Смоліч) у склад Камітэта грамадскай бяспекі [29]. На пасяджэнні наступнага дня А. Смоліч паведаміў, што ўначы быў арганізаваны Беларускі Народны Сакратарыят, які прыняў Устаўную грамату. Ён пазнаёміў прысутных з тэкстам Граматы і закончыў сваё выступленне сцвярджэннем, што «распачынаецца дзяржаўнае існаванне Беларускага краю» [30]. Польскія сацыялісты віталі з'яўленне Народнага сакратарыята. А вось сябра ПРМЗ К. Дэмідэцкі-Дэмідовіч выказаў занепакоенасць, заявіўшы, што «палітычны твар сяброў сакратарыята невядомы» [31]. Польская грамадскасць таксама спрабавала ўзмацніць свае пазіцыі. 21 лютага 1918 г. Выканкам ПРМЗ прыняў рашэнне пра пашырэнне свайго складу за кошт прадстаўнікоў мінскіх польскіх арганізацый [32].

---

[28] Goniec Miński. 1918. Nr 12.

[29] НГАБ у Мінску. Пратаколы паседжанняў Мінскай гарадской думы. 1918 г. Ф. 24, воп.1, адз. зах. 3672, арк. 94 адв. – 95 адв.

[30] Тамсама, арк. 106 адв.

[31] Тамсама, арк. 107.

[32] Dziennik Miński. 1918. Nr 33.

Сітуацыя ў Мінску была напружанай. Жыхары ведалі, што да горада набліжаюцца нямецкія войскі і часткі I Польскага корпуса. Але хто ўвойдзе першым? Якім будзе далейшы лёс Мінска? Яшчэ ўвечары 20 лютага адказу на гэтае пытанне не было. Дарэчы, па сцвярджэнню Е. Асмалоўскага, 20 лютага генерал Ю. Доўбар-Мусніцкі накіраваў генералу Хофману тэлеграму, у якой паведамляў, што Мінск заняты польскім войскам і прасіў не ўводзіць у горад нямецкія часткі [33].

21 лютага ў Мінск уступілі немцы. На чыгуначным вакзале камандуючага экспедыцыйным корпусам графа Ёрка вітала польска-беларуская дэлегацыя ў складзе Ігнацыя Віткевіча, Эдмунда Івашкевіча, Чэслава Крупскага, З. Нагорскага, Рамана Скірмунта і Паўла Алексюка. Р. Скірмунт ад імя польскага і беларускага насельніцтва выказаў надзею, што нямецкія ўлады да цывільнага насельніцтва будуць ставіцца з лагоднасцю і памяркоўнасцю. Граф Ёрк у адказ ахарактарызаваў намеры нямецкіх уладаў у адносінах да мясцовага насельніцтва як прыхільныя і сяброўскія [34].

Падобна на тое, што 21 і 22 лютага ў Мінск уступілі і польскія часці. Па меншай меры 23 лютага 1918 г. ваенная камендатура горада былаператворана загадам палкоўніка Бяліньскага ў камендатуру I Польскага корпуса. Пратакол пасяджэння Мінскай гарадской думы ад 25 лютага 1918 г. данёс да нас водгукі канфлікта паміж Думай і польскай камендатурай. Камендатура распачала рэквізіцыю маёмасці земства, якая знаходзілася на складах Мінска і кантралявалася Камітэтам грамадскай бяспекі. Дума заявіла пратэст. На гэтым жа пасяджэнні быў выказаны чарговы пратэст супраць гвалтаў, якія чынілі ў адносінах да мясцовага насельніцтва вайскоўцы ПК [35].

Паводзіны камандавання корпусу выразна адрозніваліся ад пазіцыі мясцовых польскіх палітыкаў. «Дзеннік Міньскі», орган ПРМЗ, артыкулам «Беларуская дзяржаўнасць» адгукнуўся на Першую Устаўную грамату. Ён цалкам падтрымаў ідэю дзяржаўнай самастойнасці Беларусі. Прычым сцвярджалася, што галоўную ролю ў яе дасягненні павінны адыграць аўтахтоны краю, а менавіта беларусы і палякі. Сучасная сітуацыя ацэньвалася як найболей адпавядаючая фармаванню краёвага ўрада, у якім «колькасная моц адных (беларусаў. — *А. С.*) будзе спалучаная з культурай і вопытам другіх» (палякаў. — *А. С.)*. Развіццё беларускай дзяржаўнасці звязвалася з далучэннем да «цывілізацыі Захаду», у працэсе якога асаблівая роля нележала польскай грамадскасці [36].

---

[33] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 2. S. 288.

[34] Dziennik Miński. 1918. Nr 31

[35] НГАБ у Мінску. Пратаколы паседжанняў Мінскай гарадской думы. 1918 г. Ф. 24, воп.1, адз. зах. 3672, арк. 107.

[36] Dziennik Miński. 1918. Nr 34.

Між тым, немцы не збіраліся ні з кім дзяліць уладу. Народны сакратарыят Беларусі быў выгнаны з губернатарскага будынка. 26 лютага 1918 г. Ю.Доўбар-Мусніцкі і прадстаўнік германскага камандавання маёр фон Вульфэн падпісалі дамову, у адпаведнасці з якой ужо 27 лютага ўсе часці корпуса павінны былі пакінуць Мінск. Корпус набыў статус «нейтральнага войска». Месцам яго дыслакацыі станавілася тэрыторыя паміж Дняпром (ад Магілёва да вусця Беразіны) і чыгункай Слуцк–Асіповічы–Лапічы–Гродзенец [37] . Гэтая дамова была поспехам польскіх палітыкаў, якія здолелі захаваць ПК. Аднак далейшыя падзеі паказалі, што гэтае войска сталася фактарам, які толькі ўскладняў становішча палякаў на Міншчыне.

Справа ў тым, што І Польскі корпус прыняў актыўны ўдзел у вяртанні землеўласнікам маёмасці, страчанай імі ў канцы 1917 – пачатку 1918 г. Вяртанне суправаджалася актамі насілля супраць сялянства і габрэйскага насельніцтва, якое падазравалася ў прабальшавіцкіх настроях. Усё гэта спрыяла росту антыпольскіх настрояў [38] . ПРМЗ спрабавала паўплываць на пазіцыю кіраўніцтва корпусам, але без поспеху. У сярэдзіне сакавіка 1918 г. Польская Рада палічыла патрэбным выдаць спецыяльнае паведамленне пра адносіны паміж Радай і камандаваннем корпуса. У камунікаце выказвалася надзея, што «рашэнні кіраўніцтва корпусам будуць прымацца з улікам усіх складаных умоваў мясцовага жыцця». Выказвалася гатоўнасць дапамагчы ў знаёмстве з гэтымі ўмовамі [39] . Камандаванне корпуса праігнаравала гэты зварот. Фактычна, з канца лютага 1918 г. корпус падпарадкоўваўся непасрэдна Рэгенцыйнай Радзе, у якой досыць моцнымі былі ўплывы «эндэцыі». У спецыяльным дакуменце варшаўскага ўрада адносна І ПК сцвярджалася, што «на беларускіх крэсах адраджаецца былая магутнасць Польшчы», што «крэсы з’яўляюцца яе неад’емнай часткай» [40] .

Увесну 1918 г. стала відавочным разыходжанне пазіцый Рэгенцыйнай Рады і Польскай Рады Мінскай зямлі адносна будучыні Беларусі. Варшава ўсё часцей глядзела на Беларусь як на частку польскай тэрыторыі. А вось Польская Рада па-ранейшаму падтрымлівала імкненне беларускіх арганізацый да незалежнасці. Праўда, будучыня незалежнай Беларусі бачылася ў цесным кантакце з Польшчай. Прыхільнасць да намаганняў беларускіх палітыкаў адлюстравалася на старонках «Дзенніка Міньскего». Аўтары публікацый падтрымалі пастулат незалежнасці Беларусі, адначасова падкрэсліўшы, што гарантыяй поспеху гэтай справы з’яўляецца беларуска-польскае паразуменне [41] .

[37] Dziennik Miński. Dodatek nadzwyczajny. 1918. 1 marca.

[38] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 2. S. 355.

[39] Dziennik Miński. 1918. Nr 51.

[40] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 2. S. 340

[41] Dziennik Miński. 1918. Nr 51, 56, 57, 61.

Польская грамадскасць Міншчыны прывітала II Устаўную грамату. На пасяджэнні Гарадской Думы 18 сакавіка тэкст Граматы прачытаў Аляксандр Цвікевіч. Сябра Польскай Рады і прадстаўнік польскай фракцыі ў Думе К. Дэмідэцкі-Дэмідовіч прывітаў Устаўную грамату і заявіў, што палякі заўсёды лічылі беларусаў гаспадарамі краю. Ён жа выказаў спадзяванне, што беларусы прызнаюць правы нацыянальных меншасцяў. Большасць абвешчаных Граматай сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, на думку выступоўцы, павінна быць абмеркавана на Устаноўчым сходзе Беларусі. Скліканне такога сходу К. Дэмідэцкі-Дэмідовіч лічыў галоўнай задачай дзейнасці Рады Усебеларускага з’езда [42].

Аднак паступова пазіцыя Польскай Рады пачынала разыходзіцца з настроямі пераважнай часткі польскай грамадскасці Міншчыны. Абурэнне часткі палякаў Міншчыны выклікаў артыкул Э. Івашкевіча «З нагоды беларускага звароту». Віцэ-старшыня ПРМЗ з разуменнем паставіўся да беларускіх прэтэнзій на тэрыторыю Віленшчыны і Гродзеншчыны. У прыватнасці, ён заявіў, што «сапраўдны інтарэс Беларусі, а значыць і кожнага з нас — мясцовых палякаў, патрабуе далучэння да Беларусі як найболей дзяржаватворчых элементаў, якімі воляй лёсу з’яўляюцца палякі або стагоддзі таму спаланізаваныя беларусы» [43].

Увесну 1918 г. стала відавочнай немагчымасць рэалізацыі палітычнай канцэпцыі ПРМЗ. Е. Асмалоўскі, аналізуючы сітуацыю, заўважыў, што шматлікія прыхільнікі незалежнай або аўтаномнай Беларусі ў саюзе з Польшчай ператварыліся ў абаронцаў ідэі інкарпарацыі «крэсаў». Дэмакратычныя і сацыялістычныя колы, групоўка Э. Вайніловіча выступалі за аўтаномную Беларусь у саюзе з Польшчай. Польскія камуністы арыентаваліся на Расію. І толькі некалькі, па словах Е. Асмалоўскага, «палякаў-беларусаў» выказваліся за суверэнітэт Беларусі [44]. Тым не менш Польская Рада Мінскай зямлі па-ранейшаму прыхільна ставілася да дзеянняў Рады БНР. Яна прывітала III Устаўную грамату, заўважыўшы, што «перад Радай БНР доўгі і цяжкі шлях да беларускай дзяржаўнасці. Аднак першыя крокі сведчаць, што абраны большасцю Рады накірунак добра прадуманы і палітычна рацыянальны» [45].

Прыхільнасць да намаганняў беларускіх палітыкаў па-ранейшаму дэманстравала групоўка Э. Вайніловіча. У сакавіку 1918 г. адбыўся пашыраны сход Мінскага сельскагаспадарчага таварыства. Апроч сяброў Таварыства на сходзе прысутнічалі прадстаўнікі гарадскіх уладаў, габрэйскай

[42] НГАБ у Мінску. Пратаколы паседжанняў Мінскай гарадской думы. 1918 г. Ф. 24, воп.1, адз. зах. 3672, арк. 185 адв.

[43] Dziennik Miński. 1918. Nr 57.

[44] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 2. S. 340.

[45] Dziennik Miński. 1918. Nr 66.

гміны, праваслаўнага брацтва і інш. Перад сабраўшыміся выступіў Язэп Лёсік, які паведаміў пра Устаўныя граматы Рады БНР, пра барацьбу за дзяржаўную незалежнасць Беларусі. Аднак падтрымкі сярод сабраўшыхся ягонае выступленне, як і дзейнасць Рады, не атрымала [46] . Выканкам ПРМЗ не падтрымаў [47] таксама ініцыятыву той жа самай групоўкі землеўласнікаў, якая пасля паразумення з Мінскім Беларускім прадстаўніцтвам звярнулася да немецкіх уладаў з прапановай адраджэння «ў адпаведнасці з гістарычнымі традыцыямі» Вялікага Княства Літоўскага пад нямецкай апекай [48] . Немцы адмовіліся разглядаць гэтую прапанову. Генерал Фалькенгаўэн, спаслаўшыся на ўмовы Брэсцкага міру, заявіў пра невыканальнасць пастулатаў мемарандума.

У палітычнай дзейнасці польскіх арганізацый Міншчыны ў 1916–18 гг. спалучыліся намаганні як беларускіх палякаў, так і дзеячоў Каралеўства Польскага, якія па волі ваеннага лёсу апынуліся ў Мінску. На працягу амаль усяго 1917 г. у гэтым саюзе дамінавалі беларускія палякі. ПРМЗ досыць прыхільна ставілася да намаганняў беларускіх палітыкаў і звязвала лёс мясцовай польскай грамадскасці з будучай аўтаномнай або суверэннай Беларуссю. Палітычныя мэты ПРМЗ амаль не разыходзіліся з мэтамі беларускага нацыянальнага руху. Ідэі інкарпарацыі не прымаліся. Яшчэ больш актыўна падтрымлівала беларусаў групоўка мінскіх краёўцаў на чале з Э. Вайніловічам. Прыкметную ролю ў гэтым польска-беларускім паразуменні адыграў Р. Скірмунт, які быў амаль што ідэальнай фігурай для дыялогу абодвух нацыянальных рухаў.

Відавочная розніца пазіцый беларускіх і літоўскіх палякаў у гэты перыяд тлумачылася станам польска-беларускіх і польска-літоўскіх адносінаў. Апошнія яшчэ на самым пачатку XX ст. набылі характар нацыянальнага канфлікту, які толькі паглыбіўся ва ўмовах германскай акупацыі Віленшчыны.

У канцы 1917 – пачатку 1918 г. польска-беларускія адносіны пагоршыліся. Сваю ролю адыграла абвастрэнне сацыяльных адносінаў у беларускай вёсцы і дзейнасць Польскага корпуса генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага, які з лютага 1918 г. падпарадкоўваўся Рэгенцыйнай Радзе. Узмацненне ў Варшаве анексіянісцкіх настрояў адносна беларускіх зямель моцна ўплывала на палітычную пазіцыю камандавання корпуса. Беларускія палітыкі пачалі ацэньваць ягоную дзейнасць як спробу польскай акупацыі Беларусі. Кіруючы орган польскага руху на Міншчыне — ПРМЗ — адпавядаў анексіянісцкім намерам Варшавы, але пазіцыі яго ўвесну 1918 г. выразна

---

[46] Porowski M. Wspomnienia. 1904–1918 (аддзел рукапісаў Бібліятэкі імя Асалінскіх, sygn.13542/II. S. 127.

[47] Biblioteka Narodowa Polski. Dział mikroform. Akc. 6797. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914–1921. T. 2. S. 487.

[48] Тамсама. S. 329.

аслабелі. Па меры ўмацавання польскай дзяржаўнасці ўсё больш мясцовых беларускіх палякаў пачынала звязваць свой лёс і лёс беларускай зямлі з Польшчай.

**ДАДАТАК**

## Ліст Марыі Магдалены Радзівіл генералу Юзафу Доўбар-Мусніцкаму ад 13.12.1917 г.

Кухціцы,
Узда,
Негарэлае,
Gouv-t de Mińsk

Шаноўны спадар генерал!

Усе палякі пераконваюць мяне, што польскія войскі размяркоўваюцца толькі там, куды іх запрашаюць, і толькі з мэтаю абароны сядзібаў ад рабунку.

Дык вось, у маім маёнтку Жарноўкі панаваў абсалютны спакой, адносіны з сялянамі і са службай былі вельмі добрымі, у чым я асабіста пераканалася, калі наведала маёнтак. Ніякіх намаганняў, каб мець у сябе палякаў, я не рабіла. Нават наадварот, калі ў мяне з’явіліся два афіцэры, паведаміла, што яны мне непатрэбныя. Фальварачнай службе я абвясціла, што не жадаю бачыць чужаземцаў як абаронцаў ад сваіх. Пасля гэтага абодва афіцэры адразу выехалі. Я бачыла іх дакументы, у якіх адзначалася, што яны прызначаныя ў Бабруйскі пав. А Жарноўкі знаходзяцца ў Ігуменскім пав. Праз некалькі дзён саранча напала на маёнтак. Пра іх спосаб захавання адносна спадарыні Завадскай, якая гасціла ў мяне, спадару генералу распавёў ужо яе муж; як яны абыходзіліся з бухгалтаркай і настаўніцай, я чула ад іх саміх. Не буду на тым доўга спыняцца. Але адносна сцвярджэння, што Вы там толькі знаходзіцеся, куды Вас запрашаюць, прыйшла мне думка, што магчыма без маёй згоды адміністратар маёнтка, вялікі баязлівец, прадпрыняў пэўныя крокі, тым болей, што яго паводзіны ад моманту катастрофы выклікаюць падазрэнне. Калі гэта і сапраўды мела месца, то хачу заявіць, каб зніклі ўсе непаразуменні, што я не жадаю мець у сябе польскае войска, што знаходжанне яго ў мяне расцэньваю як гвалт, і прашу не марудзячы адклікаць яго. Гавораць, што ёсць шмат грамадзянаў, якія лічаць сябе палякамі і імкнуцца мець у сябе польскае войска дзеля абароны т. зв. польскай маёмасці. Я беларуска, і мая ўласнасць, таксама як і мая асоба, не польскія, так што няма падставы для непатрэбнай і непажаданай мне апекі.

Пра адну са спраў фонду «Чышма» нам хочацца расказаць падрабязней. У маі гэтага года ў Беларусі, якая першая прыняла на сябе напад ворагаў у 1941 г., праходзілі мерапрыемствы, прысвечаныя 55-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Актыўнымі ўдзельнікамі гэтых памятных падзей былі Фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны «Чышма» (г. Мінск: прэзідэнт фонду — Іран Багданаў, віцэ-прэзідэнт — Валерый Яляеў, старшыня праўлення фонду — Джон Нігматулін, дырэктар Культурнага цэнтра — Нарыман Гайфулін, актывісты — Халіда Стромух, Кірыл Гром) і Казанскі татарскі дзяржаўны маладзёжны тэатр на чале з мастацкім кіраўніком, рэжысёрам гэтага тэатра, заслужаным дзеячам мастацтваў Рэспублікі Татарстан Фарытам Хабібуліным. 4–7 мая тэатр паказаў гледачам Гродна і Мінска на татарскай мове спектакль паводле п’есы вядомага татарскага пісьменніка Ш. Ракіпава «Зорныя ночы» аб лётчыцах 46 авіяцыйнага Таманскага гвардзейскага палка. У цэнтры спектакля — вобразы дочак татарскага народа Магубы Сыртланавай і Вольгі Санфіравай, якая загінула і пахавана ў Беларусі (Гродна). Пасля кожнага спектакля адбываліся незабыўныя сустрэчы з татарамі і башкірамі — членамі фонду «Чышма», ветэранамі, якія былі вельмі ўдзячны за выдатную ігру, за тое, што ўпершыню за 600 год пражывання татараў на зямлі Беларусі яны пачулі са сцэны родную татарскую мову. Сустрэчы заканчваліся песняй «Туган тэль» у выкананні артыстаў Маладзёжнага тэатра і ўдзячных гледачоў.

Эстафету, прысвечаную 55-годдзю Перамогі, прадстаўнікі Татарстана і фонду «Чышма» працягнулі ў горадзе-героі Брэсце, усклаўшы вянкі да Вечнага агню на тэрыторыі Мемарыяла «Брэсцкая крэпасць – герой».

На ўрачыстым шматтысячным мітынгу, што адбыўся ў Брэсцкай крэпасці, Ф. Хабібулін ад імя народа Татарстана і Прэзідэнта Рэспублікі Татарстан Мінцімера Шайміева павіншаваў ветэранаў, гасцей з краін СНД і далёкага замежжа са святам Перамогі і падзякаваў беларускаму народу і кіраўніцтву краіны за іх адданасць ідэалам братэрства і захаванне памяці аб тых, хто аддалі жыццё ў барацьбе з фашызмам.

Пасля мітынгу каля Вечнага агню ва ўрачыстых абставінах ветэранам вайны — членам фонду «Чышма» С. Абдуліну, А. Гарыфуліну, Н. Мусіну,

Ф. Нугуманаву, Я. Гайфуліну і іншым была ўручана спецыяльна выдадзеная фондам да юбілею Перамогі кніга «Навекі разам» — аб сынах і дочках татарскага і башкірскага народаў, якія абаранялі зямлю Беларусі ад нацыстаў.

Завяршылася свята сумеснымі канцэртамі вакальнага ансамбля «Чышма» і артыстаў Казанскага татарскага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра ў сценах Брэсцкай крэпасці і ў гарадскім парку культуры.

Бясспрэчна, усё гэта садзейнічала замацаванню ўзаемаразумення і сяброўства паміж народамі Татарстана і Беларусі, далейшаму развіццю татарскай дыяспары Беларусі, кантактаў са сваёй гістарычнай радзімай.

*Пераклад з рускай **Вольгі Мазуравай***

**Ібрагім Канапацкі (Мінск)**

## БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ ЯК СКЛАДОВАЯ ЧАСТКА АГУЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

Апошні перапіс насельніцтва (1999 г.) засведчыў, што ў Рэспубліцы Беларусь пражывала 10 089 татараў [1]. На тэрыторыі Беларусі, гэтаксама як і ў суседніх Літве і Польшчы, татары расселены дысперсна. Найбольшыя абшчыны татараў знаходзяцца ў Мінску і Мінскай вобласці — 3 841 чал., у Гродзенскай вобласці — 2 155 чал., Віцебскай вобласці — 1 258 чал., Гомельскай вобласці — 1 127 чал., Брэсцкай вобласці — 933 чал., Магілёўскай вобласці — 775 чал. 8 327 татараў жывуць у гарадах і 1 762 — у сельскай мясцовасці. 44% ад агульнай колькасці ўсіх татараў складаюць жыхары Мінска і Мінскай вобласці, 23% — Гродзенскай вобласці, па 9% — Віцебскай і Гомельскай абласцей, 8% — Брэсцкай і 7% — Магілёўскай вобласці.

Вылучаюцца дзве групы татараў — калі не лічыць крымскіх (36) і сібірскіх (21): «традыцыйныя», беларускія (або літоўскія — па назве Беларуска-Літоўскай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага), якія пасяліліся тут у выніку некалькіх хваляў спачатку з Залатой Арды, а пасля яе падзення ў канцы XV ст. пераважна з Крымскага ханства, і «пазнейшыя» татары (з Волгі, Урала, Сібіры і Крыма), перасяленне якіх пачалося пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай

[1] За апошняе дзесяцігодзе колькасць татараў скарацілася ў Рэспубліцы Беларусь больш чым на 2,5 тыс. чалавек.

і захопу Крыма. Даволі многа пераехала татараў на Беларусь пасля таго, як пачаліся пошукі радовішчаў нафты і яе пераапрацоўка на нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах Беларусі.

У расійскіх і савецкіх перапісах (гэтаксама, як і ў апошнім перапісу 1999 г. у Рэспубліцы Беларусь) беларускія татары не вылучаны асобна — як, напрыклад, згаданыя крымскія і сібірскія татары і нават экзатычныя для Беларусі нагайцы (14) або туркі-асманы (35), хоць вядома, што беларускія татары адрозніваюцца ад астатніх татараў па мове і звычаях. Хутчэй за ўсё, тут спрацавала недастатковая навуковая дасведчанасць, нераспрацаванасць метадалогіі ў вызначэнні тэрміналогіі пры перапісах.

Думаю, меў рацыю прафесар М. Піліпенка, які ў артыкуле «Роля татараў у беларускім этнагенезе» заўважыў, што «роля татараў у беларускай нацыянальнай гісторыі высветлена недастаткова. Да гэтага часу не пераадолены да канца погляд, які атаясамлівае ролю татараў у вялікарускай і беларускай гісторыі. Між тым для такога атаясамлівання няма падстаў» [2].

У практыцы грамадскай дзейнасці на ніве нацыянальна-культурнага адраджэння беларускіх татараў прыходзіцца сустракацца з рознымі недарэчнасцямі. Недзе ў сярэдзіне 1998 г. у рамках праекта аб'яднання Расіі і Беларусі адбылася сустрэча прадстаўнікоў расійскай дыяспары з тагачасным міністрам па справах нацыянальнасцей Расійскай Федэрацыі Рамазанам Абдулатыпавым. На яе была запрошана даволі вялікая і прадстаўнічая дэлегацыя рускай дыяспары і прадстаўнікі беларускіх татар. Дзіўна было слухаць на гэтай сустрэчы пра тое, што беларускія татары з'яўляюцца расійскай дыяспарай.

Агульнавядома, што беларускія татары з'яўляюцца адметным народам, які жыве на землях Беларусі, Літвы і Польшчы вось ужо шэсць стагоддзяў. У 1997 г. споўнілася 600 гадоў з часу зафіксаванага летапісамі і хронікамі афіцыйнага асадніцтва на землях Вялікага Княства Літоўскага татараў-мусульман. Па вызначэнні ЮНЭСКО, народ, які жыве на Богам дадзенай яму зямлі 500 гадоў, лічыцца карэнным народам. Прафесар А. Грыцкевіч лічыць, што літоўскія татары сфарміраваліся як народнасць у XIV–XVII стст. на землях ВКЛ у перыяд існавання Залатой Арды і пасля яе распаду, калі адбывалася фарміраванне асобных цюркамоўных народнасцей пад агульнай назвай «татары». У праве на адметнасць і самастойнасць беларуска-літоўскім татарам не адмаўляюць і даследчыкі Татарстана. У 1995 г. у Казані накладам у 5 000 экземпляраў выйшла манаграфія прафесара Якава Грышына «Польска-літоўскія татары (нашчадкі Залатой Арды)». У мінулым 1999 г. таксама ў Казані пабачыў свет «Татарскі энцыклапедычны слоўнік» — першае, як адзначаецца ў анатацыі, — універсальнае

---

[2] Першая міжнародная навуковая канферэнцыя «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы». Мн., 1994. Ч. 1. С. 38–39.

навуковае выданне, прысвечанае татарскаму народу і Татарстану ў яго гістарычных межах са старажытных часоў да нашых дзён». У кнізе звыш 16 тыс. артыкулаў, у тым ліку каля 7 тыс. біяграфічных. Ёсць артыкул «Польска-літоўскія татары», у якім знаходзім: «Польска-літоўскія татары — самастойная этна-тэрытарыяльная супольнасць татараў. Агульная колькасць польска-літоўскіх татараў паводле дадзеных 1993 г. — звыш 26 тыс. чалавек, у тым ліку ў Беларусі — звыш 10 тысяч, каля 4 тысяч — у Літве, у Польшчы — звыш 5 тысяч. Мова ў асноўным беларуская, літоўская і польская. Пісьменнасць на аснове кірыліцы і лацінскай графікі. Вернікі — польска-літоўскія татары — у асноўным мусульмане-суніты. Пачалі фарміравацца ў канцы XIV ст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага з выхадцаў з Залатой Арды, а пазней з Вялікай і Нагайскай Ордаў, Крымскага ханства, дзе ў першай палове XV ст. утварылі васальнае Літве княства — Джагалдай» [3].

Першыя звесткі пра знаходжанне татараў на тэрыторыі Беларусі гісторыкі адносяць да пачатку XIV ст. Вялікія князі ВКЛ Гедымін, Кейстут, Альгерд запрашалі татараў з Залатой Арды на службу і выкарыстоўвалі ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. Асаблівую апеку татарам аказваў Вітаўт, які разлічваў на іх як на ўмелых коннікаў і сяліў пераважна на заходніх межах дзяржавы і ў наваколлі буйных замкаў. У 1395 г. Вітаўт прыняў разбітага Цімурам хана Залатой Арды Тахтамыша, які быў паселены са сваёй дружынай у г. Лідзе. Шмат татараў было перасялена ў ВКЛ у выніку сумеснага паходу Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў (1397; гэтая дата традыцыйна лічыцца пачаткам пасялення татараў на Беларусі) і Крым (1398). Яны былі размешчаны на берагах р. Вакі каля Вільні, а таксама ў самой Вільні, у Трокскім, Ашмянскім, Лідскім, Навагрудскім, Брэсцкім паветах, на Валыні і ў Аўгустоўскай губерніі.

Татары пасяляліся ў Беларусі згуртаванымі родаплемяннымі групамі (улусамі), што ўплывала на іх ваенна-адміністрацыйны лад. Усе ваеннаслужачыя татары падзяляліся на харуствы (тыя ж племянныя улусы), а ў ваенных адносінах на сцягі (атрады). Часта харуствы і сцягі супадалі. Татары асядалі ў Беларусі неадначасова, таму іх улусы не займалі які-небудзь пэўны павет. У люстрацыі татараў Вялікага Княства Літоўскага згадваецца 6 «фамілій» (харустваў, родаплемянных груп), з якіх Уланская (уланы, агланы) — нашчадкі малодшых ліній залатаардынскіх ханаў — налічвала 179 дамоў, 5 іншых склаліся на аснове плямёнаў, што ўваходзілі ў Залатую Арду і прынялі ўдзел у этнагенезе шэрагу цюркскіх народаў Паўночнага Прычарнамор’я і Сярэдняй Азіі (падаюцца ў парадку пасялення ў ВКЛ). Уйшунская

---

[3] Джагалдай (Ягалдай) — невялікае татарскае ўладанне ў складзе ВКЛ (існавала прыкладна на тэрыторыі сучаснай Курскай вобласці і прылягаючых да яе земель). Заснавана ў 1438 г. выхадцамі з Залатой Арды. Існавала да пачатку XVI ст. на правах васальнага ўладання літоўскіх князёў. Гл.: Татарский энциклопедический словарь. Казань, 1999. С. 172.

харуства склалася з цюркскага племя уйшун (уйсын, усын, юшын), 244 дамы ў Трокскім, Віленскім і Лідскім паветах. Найманскае харуства адпавядала цюркскаму племю найманаў, 126 дамоў у Ашмянскім і Віленскім паветах. Джагалдайская харуства прадстаўляла нашчадкаў племя джалаір, у склад якога ўвайшлі цюркскія плямены і якія прынялі ў XIII ст. гэтую назву, 74 дамы ў Віленскім, Навагрудскім і Ашмянскім паветах. Кангарацкае харуства адпавядала племю канграт, 71 дом у Трокскім, Віленскім, Ашмянскім і Мінскім паветах. Племя барын, старэйшыя роды якога былі аднымі з вышэйшых у Крыме, мела 82 дамы ў Навагрудскім і Мсціслаўскім паветах.

Паводле сацыяльна-эканамічнага становішча татарскае насельніцтва на землях ВКЛ у XVI–XVII стст. можна ўмоўна падзяліць на тры катэгорыі. Найбольш прывілеяваная група — прамыя нашчадкі залатаардынскіх ханаў (Астрынскія і Пунскія) і мурзаў, якія атрымалі тытулы князёў: Асанчуковічы, Барынскія, Кадышэвічы, Карыцкія, Крычынскія, Лоўчыцкія, Смольскія, Талькоўскія, Юшынскія і іншыя. Яны валодалі вялікімі вотчынамі з сялянамі, за што павінны былі несці ваенную службу. Да другой належалі нашчадкі простых воінаў. Яны атрымлівалі невялікія надзелы зямлі і апрача ваеннай службы выконвалі павіннасці на карысць вялікага князя (транспартную, кур’ерскую, каравульную і інш). У 1561 і 1568 гг. яны атрымалі прывілеі на шляхецтва ад караля Жыгімонта II Аўгуста (зацверджаны у 1576, 1608 і 1634 гг.). Да трэцяй групы адносіліся гарадскія («простыя») татары — самая бедная група татараў у Беларусі. Паходзілі яны з перасяленцаў, якія на гістарычнай радзіме былі не феадаламі, а вольнымі або залежнымі «ясачнымі людзьмі». У гарадах і мястэчках ім адводзілася зямля пад сядзібы і агароды. Яны неслі павіннасці, як і мяшчане, плацілі пагалоўны падатак. Асноўнымі іх заняткамі былі рамізніцтва, гарбарства, агародніцтва, жывёлагадоўля.

З другой паловы XVII ст. ў татарскім асяроддзі знікаюць племянныя адрозненні, татарскія пасяленцы ўсё часцей прымаюць беларускія прозвішчы: Кандратовічы (нашчадкі племя кунгратаў), Бараноўскія (нашчадкі племя Барын), Карыцкія (нашчадкі рода Уланаў), Александровічы, Гембіцкія, Раецкія, Смольскія і інш. Знікла і асобая татарская адміністрацыя — харунжыя (ваенныя), маршалкі (земскія), кадзі (суддзі).

Нягледзячы на пэўныя льготы і рэлігійную верацярпімасць (свабодна дазвалялася вызнаваць іслам і будаваць мячэці), татары ў ВКЛ не мелі права ўдзельнічаць у выбарах у Сейм і мясцовыя сеймікі, займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Аднак шэраг татараў вызначыліся на дыпламатычнай службе, былі «пісарамі татарскімі» — перакладчыкамі з татарскай і турэцкай моваў у адносінах з Крымам і Турцыяй. Найбольш вядомы з іх князь Абрагім Тымірчыч у пачатку XVI ст. — «пісар татарскі» канцылярыі ВКЛ пры вялікіх князях Аляксандры і Жыгмонце I.

Такім чынам, у канцы XIV–XVI ст. татары Вялікага Княства Літоўскага (жылі на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Валыні, Падолі) склаліся

ў самастойную этнатэрытарыяльную супольнасць — літоўскія татары, якіх разам з карэннымі татарамі (жылі на Падляшшы) называлі польска-літоўскімі татарамі, з 1920-х гадоў — беларуска-літоўскімі, беларускімі татарамі, у канцы XX ст. — заходнімі татарамі. Перасяленцаў з татарскіх ханстваў адзначалася ўсё менш, іх апошнія хвалі склалі татары — уцекачы з Паволжжа ў 2-й палове XVI ст., пасля заваявання Расійскай дзяржавай Казанскага і Астраханскага ханстваў, і мігранты з Крыма ў XVII – пачатку XVIII ст. (толькі на Украіну).

Татары, якія пасяліліся на тэрыторыі Беларусі ў перыяд сярэдневякоўя, адносяцца пераважна да этнічных супольнасцей Крымскага паўвострава, Паўночнага Каўказа і часткова Паволжжа. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца этнакультурныя асаблівасці беларускіх татараў. Іх мова адносіцца да кіпчацкай групы цюркскіх моваў, якія былі пашыраны галоўным чынам на поўдні. Прафесар М. Піліпенка адзначае, што па антрапалагічнаму тыпу беларуска-літоўскія татары таксама бліжэй да татараў поўдня, тых, што знаходзіліся на Крымскім паўвостраве, Паўночным Каўказе, на захадзе Паволжжа. Татары ВКЛ адрозніваліся ад этнасаў Цэнтральнай і Сярэдняй Азіі і сваім гаспадарча-культурным тыпам. У іх гаспадарцы пераважала земляробства, у прыватнасці, агародніцтва, садаводства, а не жывёлагадоўля. Беларускія татары адрозніваліся ад азіяцкіх рэлігійнымі вераваннямі.

Для разумення ролі татараў-мусульман у беларускай нацыянальнай гісторыі неабходна звярнуць увагу і на месцы іх асадніцтва. Першапачаткова больш за ўсё яны пасяляліся ў цэнтральнай частцы Белай Русі — у Панямонні, а затым на яе поўдні і поўначы. Менавіта спачатку ў цэнтральнай частцы Белай Русі, а затым на яе поўдні і поўначы ў гэты час утварыўся беларускі этнас, фарміравалася яго мова і комплекс традыцыйнай культуры. Усе гэтыя фактары былі ўмовай таго, што асобныя групы татараў-мусульман бралі ўдзел у беларускім этнагенезе. Пра гэта сведчаць многія факты, у прыватнасці, назвы рэк (Уса – вада, Сула – слабы, вялы, Гаўя – заслуга, Шчара – жоўтая, Жыжма – жаночае татарскае імя), паселішчаў (са шматлікіх этнанімічных назваў, што трапляюцца на карце Беларусі, вельмі частымі з'яўляюцца тыя, якія ўтвораны ад слоў «татарын» або турак. Усяго такіх найменняў, як лічыць прафесар В. В. Шур, захавалася да нашых дзён у Беларусі больш за 25).

У новай сваёй Айчыне татарскія пасяленцы арганічна ўжываліся, з пакалення ў пакаленне, у мясцовы сацыяльна-палітычны і бытавы ўклад жыцця, станавіліся паўнапраўнымі грамадзянамі, а ў выпадку неабходнасці — самаадданымі абаронцамі краіны. Гэтымі патрыятычнымі якасцямі беларуска-татарскія воіны вызначаліся ў супрацьстаяннях ВКЛ нашэсцям не толькі з захаду (крыжакі, гераізм татарскай конніцы ў бітве пад Грунвальдам) або з усходу (Масковія), але таксама з боку крымскіх татараў, якія спусташалі набегамі межы дзяржавы. У актах Літоўскай метрыкі захаваўся знакаміты адказ тутэйшых татараў — своеасаблівы заклік да рыцарскага

гонару адзінаверцаў, што ўварваліся ў межы краіны: «Ні бог, ні Прарок … не загадваюць вам рабаваць, а нам быць няўдзячнымі. Мы паважаем вас як драпежнікаў і шаблямі нашымі знішчаем рабаўнікоў, а не братоў нашых». У супліцы татараў да караля Жыгімонта ёсць упамінанне пра прысягу, якую на шаблях давалі іх бацькі, што будуць вернымі беларусам, з якімі «…пясок, вада і дрэвы з'яўляюцца нам агульнымі». Ці вось яшчэ прыклад. Падчас руска-польскай вайны 1792 г. татарскае насельніцтва аднадушна заявіла аб сваёй падтрымцы законнай улады. Як адзначала газета «Народова і обца», «народ татарскі праз трох пасланых ад яго дэпутатаў паведаміў на правінцыяльнай сесіі Вялікага Княства Літоўскага, што як і ў Варшаве, так і ў правінцыях адважныя салдаты, сабраўшыся да сваіх мулаў, прысягалі на Кур'ане бараніць караля, Бацькаўшчыну і Канстытуцыю».

Вядомыя сваімі подзвігамі і ўмельствам у баях як шэраговыя воіны, так і камандзіры. Гэта перш за ўсё генералы Юсуф Беляк, Якуб Ясінскі, які загінуў у прадмесці Варшавы — Празе. Вядомасць атрымалі і іншыя генералы, такія, як Муса Сулькевіч, многія афіцэры, што змагаліся за свабоду і незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны.

Мужнасць беларускіх татараў і пралітая кроў у абароне Рэчы Паспалітай былі прычынай таго, што польска-літоўска-беларускае грамадства прызнала іх за сваіх, за паўнапраўных і паўнавартасных грамадзян. Ян Дуклян Ахоцкі ў сваіх мемуарах, успамінаючы пра розныя роды Оўруцкай зямлі, так пісаў пра беларускіх татараў: «…ёсць татары перакопскія, кіпчакі, што былі на службе Рэчы Паспалітай, некаторыя засталіся ў Оўруцкай зямлі, прынялі хрысціянскую веру, а большасць у Літве трымаюцца пры сваёй даўняй веры, маюць мячэці і мулаў. З такой вось сям'і і быў той слаўны генерал Беляк і нямала вышэйшых афіцэраў: Ахматовічы, Азулевічы і г. д., якія да скону свайго жыцця верна служылі абранай Радзіме. Трэба аддаць належнае ўсім сем'ям без выключэння, […] натуралізаваная ў краіне новая шляхта палюбіла новую Айчыну і верна ёй служыла».

У XVI – пач. XVII ст. татары ВКЛ паступова страцілі сваю родную мову і сталі карыстацца беларускай (пазней таксама польскай, а з XIX ст. і рускай). Існуе перакананне, што беларускія татары забылі сваю мову таму, што бралі сабе за жонак славянскіх дзяўчат і тыя выхоўвалі дзяцей на беларускай мове.

Пэўная доля ісціны ў гэтым ёсць. Але вядома з гісторыі, што пры пасяленні венграў над Дунаем яны прыйшлі і пасяліліся тут зусім без сваіх жанчын, але навучылі іх венгерскай мове, прыняўшы хрысціянства, не зліліся з навакольнымі народамі. Татары мелі сваіх жанчын, дзяцей і маглі прадаўжаць свой род. Галоўнае для татарына было тое, каб трымацца сваёй мусульманскай веры. Святыя кнігі мусульман напісаны на арабскай мове і на арабскай мове адпраўляюцца малітвы. Будучы адкрытым народам, які не мае ніякіх таямніц ад навакольнага насельніцтва, беларускія татары яшчэ ў XVI ст. стварылі багатую літаратуру — на беларускай і польскай мовах арабскім пісьмом — кітабы, тэджвіды, тэфсіры, хамаілы.

Цяпер тутэйшыя татары разумеюць больш за сто тысяч слоў, а праз беларускую мову лёгка разумеюць польскую, славацкую і іншыя славянскія мовы. У той жа час татары перадалі ў беларускую мову шмат цюркізмаў (па падліках Я. Якубоўскага, больш за 600). У паўсядзённым жыцці, у рэлігійнай лексіцы беларускіх татараў ужываюцца каля 300 слоў, якія зразумелыя татарам і не патрабуюць перакладу. Можна быць татарынам, хоць і не ведаць татарскай мовы. Можна быць беларусам і не карыстацца беларускай мовай. Жывучы расцярушана ў Беларусі, часам па некалькі сямей у вёсцы ці мястэчку, татары звужалі свой слоўнікавы склад, а такая група абыходзілася некалькімі тысячамі слоў.

Некаторым нашым дзеячам не хапае 100 000 беларускіх слоў, каб выказаць вялікія ідэі, а таму яны і не карыстаюцца беларускай мовай. Наш малы татарскі народ на Беларусі цалкам задаволены багаццем беларускай мовы, таму і карыстаецца гэтай мовай на вуліцы, на працы, дома, у думках і снах. Толькі ў малітвах мы, як мусульмане, карыстаемся арабскай мовай, а нашы святыя кнігі пераклалі на беларускую мову, каб ведаць, аб чым у іх гаворыцца.

Паводле савецкага перапісу 1989 г., з 12,5 тысяч татараў каля 8 тысяч назвалі роднай мовай беларускую. Як заўважыў прафесар А. Каўка, з усіх іншаэтнічных супольнасцей у краіне беларускія татары былі адзінымі, хто ў сувязі з ініцыяваным Прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам рэферэндумам (май 1995 г.) аб наданні рускай мове статуса дзяржаўнай, як і беларускай, не хавалі сваёй трывогі, каб узаконенае двухмоўе не абярнулася далейшым узмацненнем асіміляцыі, зніжэннем і без таго моцна аслабленага грамадскага прэстыжу роднай мовы беларусаў, што фактычна пасля рэферэндуму адбылося і адбываецца. Зварот дзеячаў татарскай культуры Ісмаіла Александровіча, Разаліі Александровіч, Аліі Усманавай, Якуба Якубоўскага і іншых да землякоў-суродзічаў, якія прагучаў у тыя дні, дастойны павагі ў святле татарска-беларускага сяброўства, узаемнай салідарнасці на карысць нацыянальнай культуры.

«Мы, беларускія татары, — гаварылася ў звароце, — жывём на Беларусі амаль 600 гадоў і больш чым 500 гадоў карыстаемся беларускай мовай як роднай. Нашы рукапісныя кнігі — аль-Кітабы захавалі беларускую мову XV–XVI стст. І не збіраемся адмаўляцца ад беларускай мовы, хоць кожны татарын разумее іншыя славянскія мовы. Калі б бацькам прапанавалі памяняць сваіх родных дзяцей на іншых, прыгажэйшых, дужэйшых і разумнейшых, нават са знакам якасці на адпаведных месцах, то хіба толькі вар'яты згадзіліся б на гэта. А ці згадзіцца хто-небудзь памяняць сваіх бацькоў на іншых? А ці ведаеце вы, як ставіліся да тых, хто мяняў сваю веру на іншую? Можа і заманьвалі ў сваю веру, але выхрыстаў ніхто не любіў і не паважаў. З 12 тысяч татар, які жывуць на Беларусі, у час перапісу 1989 г. большасць сцвердзілі, што родная іх мова беларуская. Мы спадзяемся, што на рэферэндуме беларускія татары, як старажылы, так і пазнейшыя пасяленцы,

выкажуцца за беларускую дзяржаўную мову без агаворак, бо далікатнасць, павага і шчырасць да народа, сярод якога мы жывём, да зямлі, дзе нарадзіліся нашы дзеці, дзе вечным сном спачываюць нашы продкі, не даруюць нам здраду сваёй Бацькаўшчыне». Цяжка сказаць, — піша А. Каўка, — колькі «татарскіх» галасоў улілося тады ў выніковае, больш чым «мільённае» беларускае «не» на згаданым вышэй галасаванні, ды не ў дакладнай лічбе справа. Важны і дарагі сам па сябе голас брацкай падтрымкі невялікім народам вялікай справы нацыянальнага самазахавання. У гэтым маральным значэнні салідарнае слова беларускіх татараў разам з падобным тады ж зваротам да беларускай грамадскасці вядомых украінскіх пісьменнікаў А. Ганчара, І. Драча, Р. Лубкіўскага ды іншых трэба, думаць, застанецца незабыўным радком у летапісу беларускага адраджэння» [4].

Сёння нашчадкі даўно забытых татарскіх ордаў — беларускія татары паспяхова працуюць ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, беражліва захоўваюць традыцыі продкаў, адраджаючы нашу супольную гістарычную і культурную спадчыну на карысць нашае маці — Беларусі (вядомыя імёны і слынных людзей: кампазітара Дз. Смольскага, члена-карэспандэнта АН Беларусі Б. Смольскага, маршала Фуада (Івана) Якубоўскага, прафесараў С. Александровіча, Х. Александровіча, І. Лебедзя, мастакоў А. Александровіч, Э. Асановіча, Б. Смольскага, Маргарыты і Ханафі Сайфугаліевых, і іншых паважаных людзей розных прафесій).

Мы цалкам падзяляем думку, выказаную У. Конанам у змястоўным і цікавым артыкуле «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Штрыхі да гістарычнага, палітычнага і духоўнага партрэта нацыі» [5]. У ім аўтар сцвярджае, што «…банальная памылка ўзнікае тады, калі беларуская нацыя атаясамляецца з усімі насельнікамі Беларусі. Тут роля іншаэтнічных груповак неадназначная. Калі яны ўключаюцца ў моўна-культурны кантэкст тытульнай нацыі, тады гэта роля творчая, канструктыўная. Калі ж яны займаюць варожую пазіцыю да гэтага культурна-нацыянальнага кантэксту, тады іхняя роля разбуральная. Бывае і так, што іншанацыянальныя меншасці жывуць замкнутаю абшчынаю, тады іх пазіцыя да нацыі нейтральная. Нават «тыя […] этнічныя беларусы, — падкрэслівае У. Конан, — якія не ўсвядомілі сябе беларусамі і аб'ектыўна не жывуць у кантэксце беларускай нацыянальнай мовы і культуры, актуальна выпадаюць з нацыі, іх прыналежнасць да яе — толькі эвентуальная, гэта значыць, толькі магчымая пры пэўных сацыяльна-палітычных умовах».

Прафесар М. Піліпенка адзначае: «Мноства фактаў сведчаць аб тым, што татары-мусульмане на Белай Русі цесна ўзаемадзейнічалі з беларусамі не толькі ў эканамічнай і палітычнай, але і ў культурнай сферах жыцця, бралі ўдзел у фарміраванні беларускага этнасу, узбагацілі яго мову

[4] Каўка А. Будам жыць! Мн.; М., 1998. С. 228–229.

[5] Літ. і мастацтва. 2000. 1 снеж.

і культуру. Беларусы і татары-мусульмане Беларусі маюць глыбокія гістарычныя сувязі. У іх агульныя інтарэсы, агульны гістарычны лёс. А таму ёсць пэўныя гістарычныя падставы для іх плённага супрацоўніцтва ў цяперашні час» [6] .

Беларускія татары жывуць у міры і згодзе з усімі народамі нашай краіны. Сваю галоўную задачу арганізацыі беларускіх татараў бачаць сёння ў адраджэнні духоўнасці ва ўзаемадзеянні з іншымі нацыянальнымі арганізацыямі і канфесіямі, скіраванай на ўратаванне грамадства, у першую чаргу, моладзі ад разбуральнага ўздзеяння так званай «масавай культуры», разгулу гвалту, п’янства, разбэшчанасці, што калечаць маладыя душы. У сваіх штодзённых малітвах мы просім Усявышняга быць міласцівым і міласэрным да зямлі, на якой мы жывём і якая стала нашай Радзімай, і да людзей, якіх беларускія татары лічаць сваімі братамі.

---

[6] Першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы». С. 42–43.

**Уладзімір Мацвееў (Мінск)**

## ЦЫГАНЫ: «дзеці сонца» маюць свайго прэзідэнта і парламент

Сёння ў нашай краіне дзейнічаюць Грамадскае аб’яднанне «Беларуская цыганская дыяспара», якое ўзначальвае Алег Казлоўскі (з сядзібай у пасёлку Бараўляны пад Мінскам), і Беларуская асацыяцыя цыганоў «Рома» (з сядзібай у пасёлку Калодзішчы), кіраўніком (баронам — ад цыганскага слова «баро», што значыць «вялікі») якой выбралі тры гады таму назад мяне. Усяго на тэрыторыі Беларусі сёння пражывае больш за 60 тысяч «ромаў», або «ромалаў», як мы называем самі сябе. Каля 90 працэнтаў з іх праваслаўнага веравызнання, каля 10 — каталіцкага. Першыя карыстаюцца кірылічным алфавітам, другія — лацінскім. Больш за ўсё нас у Гомельскай вобласці (Калінкавічы, Васілевічы, Гомель), а таксама на Брэстчыне, пад Мінскам. Тут мы аселі пасля хрушчоўскага Указа 1962 г. аб спыненні вандроўнай дзейнасці цыган. На жаль, амаль палавіна нашага насельніцтва пражывае ў зоне чарнобыльскага забруджання. Ёсць у нас і іншыя праблемы. Найперш — нізкі ўзровень пісьменнасці, адсутнасць навуковай эліты. Адзіны цыган-гісторык, Ваня дэ Жыла-Каханоўскі, сёння пражывае ў Францыі. Праўда, родам ён з Беларусі, з Брэста. Калі мы нядаўна, 25–28 ліпеня, былі ў Празе на V кангрэсе Сусветнага цыганскага саюза, ён увесь час гарнуўся да нас, распытваў пра зямлю сваіх продкаў.

А цяпер — пра сам кангрэс. Яму папярэднічала вялікая работа. Менавіта па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам беларускіх «дзяцей сонца» быў створаны ўсходні блок, куды ўвайшлі Расія, Беларусь, Украіна, Літва, Латвія і Эстонія. Таму і на кангрэсе мы маглі праводзіць сваю лінію, сваю палітыку. Мы — гэта Алег Казлоўскі, яго намеснік Артур Гоманаў, віцэ-прэідэнт нашай асацыяцыі «Рома» Уладзімір Уладзіміравіч Мацвееў і аўтар гэтых радкоў. Першы з іх быў выбраны членам парламента, другі — уключаны ў камісію па Халакосту, трэці — у камісію па сацыяльных пытаннях і эканоміцы, а я ўвайшоў у склад Канстытуцыйнага суда.

На кангрэсе быў выбраны першы прэзідэнт Сусветнага цыганскага саюза. Ім стаў доктар Эміль Шчука (дарэчы, ён днямі прыязджаў у Мінск на вяселле свайго сына). Штаб-кватэрай Міжнароднага цыганскага парламента будзе Вена. На кангрэсе разглядалася таксама пытанне аб стварэнні Еўрапейскага універсітэта з выкладаннем на цыганскай мове нашай гісторыі, этналогіі і культуры. Праблема адукацыі асабліва актуальная для Беларусі, дзе да сённяшняга дня няма ніводнай цыганскай школы і нават ніводнага цыганскага класа. Толькі 20 працэнтаў нашых дзяцей ходзяць у школы і дашкольныя ўстановы.

І яшчэ адно балючае пытанне. Як вядома, фашысцкі рэжым жорстка праследаваў цыганоў з-за іх «арыйскага» (з Індыі) паходжання. Пасля апошняй сусветнай вайны ў Беларусі засталося не больш аднаго працэнта іх даваеннага насельніцтва. У Брэсце знаходзіўся адзіны ў Еўропе канцэнтрацыйны лагер для цыганоў. Сёння нам вядома шэсць месцаў масавых расстрэлаў нашых супляменнікаў. Таму ў нас востра стаіць праблема матэрыяльных кампенсацый ахвярам Халакосту і іх нашчадкам. Сума, выдзеленая Беларусі толькі нямецкім фондам «Халакост», роўная 348 мільёнам долараў ЗША. Але атрымаць іх вельмі няпроста. Ёсць тут і аб’ектыўныя прычыны: будучы вандроўнікамі, «ромалы» амаль не ведалі, што такое пашпарт. Чамусьці нам, не давяраючы, чыняць перашкоды і ў стварэнні адпаведнага фонду. Вядома, мы можам стварыць яго і за межамі нашай краіны. Але тады будуць згублены значныя сумы. А іх можна было б выкарыстаць на развіццё адукацыі, увекавечванне памяці ў месцах масавых рэпрэсій, стварэнне для цыганоў новых рабочых месцаў.

Беларусы павінны болей ведаць пра цыганоў, пра іх складаную гісторыю. Тады і знікне недавер паміж намі, наладзіцца ўзаемнае разуменне і супрацоўніцтва.

**Капитон Быков (Минск)**

## БЕЛОРУСЫ И ЧУВАШИ

Белорусы и чуваши: что общего между ними? Ведь они находятся друг от друга на огромном расстоянии, исчисляемом почти двума часовыми поясами, да и в анналах истории их пути никогда не пересекались. Но в то же время на различных этапах развития многие вехи истории этих народов совпадают или близки по характеру происходящих событий. Достаточно напомнить, что:

- в известные времена через Беларусь проходил торговый путь «из варяг в греки», а через Чувашию — аналогичный путь «из варяг в хазары»;
- чувашская земля, так же как и белорусская, в течение нескольких веков была ареной больших исторических событий. Она подвергалась постоянным нашествиям и опустошительным войнам со стороны Хазарского каганата, монголо-татар, Казанского ханства и т. д.;
- в разные исторические периоды Беларусь входила в состав ВКЛ, Речи Посполитой, России, так же и чуваши оказывались в клещах хазар, монголо-татар, новгородских князей, казанских ханов;
- как белорусы пережили период окатоличивания и ополячивания, так и чуваши выдержали и не покорились повальному омусульманиванию и отатариванию.

Приведенные выше аналогии свидетельствуют о том, в каких сложных условиях происходило становление белорусов и чувашей. Историки считают чувашей потомками волжских булгар. После распада Великой Волжской Булгарии большая часть из них ушла за Дунай и образовала Дунайскую Булгарию, оставшаяся часть переселилась на правый берег Волги, где впоследствии сложился чувашский этнос. Формирование единой народности проходило очень сложно и долго и завершилось лишь на рубеже XV–XVI вв. Мне кажется, что этот затяжной характер объясняется прежде всего местопроживанием чувашей: на исторической линии соприкосновения двух частей света — Европы и Азии, «встречи» двух цивилизаций — восточной и западной, и двух религий — христианской и мусульманской.

Но постепенно с исторической арены исчезли Волжская Булгария, Хазарский Каганат, распалась Золотая Орда, ушли в прошлое Ханства Казанское, Сибирское и прочие. А чувашский народ остался со своей культурой языком, обычаями, традициями и со своим менталитетом.

Затем наступила новая эпоха для чувашей. Во второй половине XVI в. Чувашия оказалась под властью Московского государства. Принято считать, что вхождение в состав России было прогрессивным событием для чувашей, т. к. в ее составе они обрели возможность жить в мирных условиях: прекратились бесконечные разорительные военные действия на чувашской

земле. Однако, на самом деле, татарский гнет сменился на русский, который нисколько не был слабее старого. В русском государстве чуваши были зачислены в разряд «черных людей», которые выполняли тяжелые повинности. Их не допускали к государственному управлению, подавляли самобытную культуру.

Вместе с тем само вхождение и последствия этого события (в том числе и последующее обращение чувашей в православие) оказались для них событиями эпохального значения. Они фактически определили весь ход новой социальной и этнической истории чувашей, избавив их от исламизации и, как следствие, реальной перспективы исчезновения как этноса.

Действительно, появление славянского этнического элемента существенно повлияло на общую культуру и быт, язык и верования чувашей. В некоторых русских источниках XVI–XVII вв. чуваши характеризуются как смирный и трудолюбивый народ. Они, пишут историки, заметно отличаются от русских по внешнему облику: смуглолицые, лоб покатый, нос тонкий, глаза карие, рост средний, а походка тяжелая, в перевалочку. Однако, во второй половине XVIII в. мы находим несколько иную характеристику: «их лица как у всех европейцев, живущих к северу. Преобладающее телосложение худощавое [...] Колоритен и своеобразен внутренний духовный мир чуваша, твердая память, мыслит конкретно, говорит медленно [...] настойчив, скрытен».

Н. Никольский считает, что чуваш очень любознателен, доверчив, верен данному слову и строго его соблюдает. Он отличается исключительным гостеприимством и почтительным отношением к старшим. Этноним «чуваш» созвучен со словом «йаваш», то есть покорный, незлобный. Помордовски «чуваш» значит «благородный, чистый, гордый». По утверждению бразильского ученого Зафирова, на языке инков слово «чуваш» переводится как «бог света».

В работе Н. Карамзина и В. Магницкого подчеркивается, что «чуваш от природы добр, бескорыстен и миролюбив; сделанная ему малость услуга обязывает его на целую жизнь благодарностью». Л. Толстой выделял в чувашах честность и исполнительность, умение почувствовать горе и страдание другого человека.

Многие исследователи утверждают, что чувашский народ — земледелец. Они всегда являлись прилежными хлеборобами. Все полевые работы наравне с мужчинами выполняли и женщины. Они сеяли рожь, пшеницу, овес, ячмень, гречиху, горох. Наибольшее значение отводилось ржи, ею засевали весь озимый клин. Техника ведения земледелия имела сходство с земледелием других народов — соха, борона. Убирали зерновые серпами. Важной отраслью крестьянского хозяйства оставалось животноводство. Кроме скотоводства, овощеводства и птицеводства чуваши издревле занимаются пчеловодством. Занимаются чуваши также огородничеством и садоводством, выращивают картофель, капусту, лук, чеснок, огурцы, морковь и

другие культуры. Из плодовых деревьев были широко распространены яблоня, вишня, слива. В народе существовала хорошая традиция: каждый в течение своей жизни должен посадить и вырастить не менее двух плодовых или других деревьев.

В прошлом, как правило, чуваши, как и белорусы, все необходимое в хозяйстве и быту изготовляли сами. Женщины пряли и ткали для нужд семьи и лишь в редких случаях для продажи. С развитием товарно-денежных отношений расширялись кустарные промыслы, такие, как производство изделий из дерева — бочек, посуды, плетение корзин, канатов и многое другое. У чувашей хорошо был развит и такой старинный промысел, как охота. Начиная с осени, они охотились на зайцев, белок, куниц, лис, медведей, куропаток. Чуваши искусные плотники, резчики художественной резьбы по дереву. Резьбой они до сих пор украшают снаружи жилые дома, ворота и различные предметы домашнего обихода. Широко развиты и промыслы, которые связаны с обработкой продуктов животноводства: изготовление валяной обуви, изделий из кожи и овчины. В каждой избе имелись необходимые принадлежности для производства тканей от прялки до ткацких станков.

Из сказанного видно, что производственная деятельность чувашей и белорусов почти ничем не отличается. А что касается других аспектов материальной и духовной культуры (языка и религии, традиций и обычаев, нравов чувашей и белорусов), можно было бы говорить долго и, как мне думается, это тема для отдельного разговора, тем более она требует дополнительных исследований и является своеобразным «полигоном» для специалистов.

После такого экскурса, пожалуй, в самый раз поставить вопрос о том, когда появился первый чуваш на белорусской земле. Сразу же отвечу, что на данном этапе однозначно назвать дату, фамилию никто не может, ибо история не сохранила никаких следов о первооткрывателях.

Но все же, в поисках ответа, я попытаюсь несколько примеров использовать для рассуждения. Еще в XVII–XVIII вв. по различным причинам происходила миграция чувашей. Если в начале XVIII века за пределами Чувашии проживало около 11% от общего числа чувашей, то уже к середине века их число утроилось и составило 35%.

Не вдаваясь в детали, можно обозначить основные причины этого процесса: поиск лучшей доли, особенно земли; привлечение чувашей к военной службе, а затем обязательное солдатское поселение; феодально-крепостнический гнет; насильственная исламизация и христианизация и др. Уходили чуваши целыми семьями и переселялись на новые места не только на востоке и на юге, некоторые направлялись и на запад. Вполне вероятно, кто-то из них мог добраться и до Беларуси. Тем более, это подтверждается конкретными примерами.

В дневниковых записях известного героя Отечественной войны 1812 г. Дениса Давыдова найдены строки: «…в том бою от верной гибели спас

меня обаятельный, остроумный и храбрейший инородец из Чебоксарского уезда Кондратий Иванов, долгое время живший среди белорусов…». Эти слова убедительно подтверждают, что Иванов оказался здесь еще до начала нашествия французов.

В унисон этому событию можно привести другой, не менее интересный пример. В 1987 году я познакомился с 87-летней жительницей Витебщины Клавдией Ивановной Ковальчук. Она себя считала белорусской чувашкой в шестом поколении. Если верить ее рассказам, то можно предположить, что ее предок на Придвинье появился в 1805 году. Он проходил рекрутскую службу. А когда началась война с французами, в одном из боев был ранен в ногу. После излечения стал инвалидом и остался жить в Бешенковичском районе. Так светловолосый Иван стал белорусским чувашом. Он оказался исключительно способным и любознательным человеком. Будучи учеником кузнеца, выполнял сложные задания мастера. К тому же он удивлял всех сельчан умением легко запоминать языки. Он еще до рекрутства свободно владел не только своим чувашским, но и русским и татарским языками. А тут за короткое время усвоил белорусский язык и свободно общался на польском. Так за три года он стал совершенно своим, и сельчане даже забыли, что он инородец и имеет фамилию Волков. Они его прозвали Ковальчуком за успехи в кузнечном деле. Помогли построить дом. Сыграли свадьбу. Через год родился сын, крещенный Василием Ковальчуком. К сожалению, других детей у чуваша не было. Кстати, у всех последующих продолжателей династии по удивительному стечению обстоятельств так же рождалось только по одному мальчику. Исключением стало рождение последней из рода Ковальчуков девочки, нареченной Клавдией Ивановной. У нее тоже не было ни братьев, ни сестер. По этому поводу отец изрек: «чертово племя». Как бы отрицая скверную традицию, Клавдия родила двух сыновей, хотя и они счастья семье не принесли. Великая Отечественная война унесла не только сыновей, но и мужа. Так 44-летняя женщина осталась одинокой, но не сломленной. Она работала, помогала другим. Отрадно и то, что она себя всегда считала чувашкой, хотя знала на чувашском языке всего три слова: хлеб, молоко и люблю. Мечтала посмотреть на Чувашию, но не получилось. Рассказав все это, она заявила: теперь могу спокойно умереть, тайну семьи не унесла с собой. Умерла она в 1989 году, и с ее смертью прервалась родословная белорусских чувашей Ковальчуков.

Грустная история, но она может быть не единственной. Нам предстоит терпеливый поиск для установления истины. Я надеюсь, что в этом благородном деле примут участие все чуваши, проживающие на этой благодатной и гостеприимной земле. К сведению, в настоящее время нас, белорусских чувашей, около трех тысяч и почти столько же белорусов проживает в Чувашской республике, которые гордо себя называют чувашскими белорусами.

В заключение все же надо уточнить: что общего в менталитете белорусов и чувашей? Снова, отвечая на этот вопрос, приведу пример. Во время службы в армии мне посчастливилось около 15 лет быть среди обеспечивающих безопасность при запуске и посадке космических кораблей. Иногда нас приглашали на постановку задач перед запуском космических экипажей. Однажды, а если быть точным, в апреле 1967 года перед вторым полетом В. М. Комарова на корабле «Союз–1», нас собрали на очередной инструктаж. До начала совещания оставалось около получаса. Короткое время космонавты балагурили (а они этим ремеслом владели в совершенстве), рассказывали разные веселые истории, прибаутки и небылицы. Нам, земным, было все интересно. Около Комарова стояли несколько авиаторов, по поведению похожих на молодых космонавтов. Зная о том, что Владимир Михайлович очень серьезный и увлекательный рассказчик, я тихонько пристроился к его группе. Не помню, о чем шел разговор, но Комаров неожиданно его прервал и, посмотрев на одиноко стоящих в стороне от остальных космонавта Николаева и незнакомого нам старшего лейтенанта, сказал:

«Посмотрите на них, как они похожи друг на друга: и ростом, и фигурой, будто братья-близнецы». Казалось бы, что у них может быть общего — Андриан старше его на 12 лет, да и по жизненному и летному опыту годится ему в отцы, а ведет себя как с равным, чтобы передать молодому коллеге все, что знает и умеет. Я давно присматриваюсь к ним. Они всегда вместе и всегда что-то увлеченно обсуждают. И что удивительно, они оба исключительно скромны, немногословны и даже немного стеснительны. Их обоих отличают аккуратность, исполнительность и ответственность, тактичность и воспитанность. У них необычайная тяга к знаниям и любознательность. И еще, это нестандартность мышления и глубина мыслей. Молодой у нас в отряде второй год. Он из Беларуси. А теперь подумайте, каким образом природа сумела одарить чуваша и белоруса одинаково высокими человеческими качествами и вселить полное взаимопонимание и духовное единство?

…С тех пор прошло много времени. Комаров погиб при посадке того испытательного корабля. Николаев и Климук (а он был именно тем молодым, которого тогда называли «тенью Николаева») по два раза выполняли полет в космос и стали не только дважды Героями, но и генералами и кандидатами наук. А слова, сказанные Комаровым, до сих пор у меня в памяти, потому что он исключительно метко и точно определил общность характеров и нравов белоруса и чуваша. Как говорят, тут комментарии излишни, ибо сама природа сделала их такими.

И, наконец, несколько цифр, характеризующих степень прочности устоев чувашских семей. Я в прошлом году провел опрос семейных пар, проживающих в Минске. Их оказалось 55. Задавал один и тот же вопрос: «Бывают ли серьезные конфликты между мужем и женой из-за неприязни или

непонимания? Опрошенных семей по национальному признаку свел в 5 групп: первая — муж и жена — чуваши (9 семей); вторая — муж (чуваш), жена (белоруска) — 31 семья, третья – муж (белорус), жена (чувашка) — 8 семей, четвертая — муж (чуваш), жена (русская) — 4 семьи и пятая — муж (чуваш), жена (украинка) — 3 семьи. Полученные ответы позволили сделать вывод: первая и вторая группы вполне благополучные (в них нет серьезных конфликтов), третья — благополучная (в них — незначительные недоразумения), а в последних — серьезные недоразумения из-за попытки жен унижать мужей. Все это еще раз подтверждает однородность менталитета чувашей и белорусов, в основе которого лежит доброта.

В одной песне поется:

Говорят, Ала-Тау — гора высокая.
Да, Ала-Тау — высокая гора.
Но есть нечто выше Ала-Тау,
Это человеческая доброта.

Мне думается, что человеческая доброта — это незабываемые страницы вековой дружбы наших народов, это вера в светлое будущее, это — мечта о счастье. Поэтому свое выступление хочу закончить словами благодарности белорусскому народу за то, что мы на белорусской земле живем как в дружной многонациональной семье народов Беларуси. За все это большое вам спасибо!

KAMUNIKAT.org